№ 5 (651) 3 лютага 2010 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

першая беларуская газета

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднoўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Самыя патрэбныя і ашчадныя пакупкі мінскіх уладаў — 2010

Старонка 4




## Ці ўпадзе еўра яшчэ ніжэй?

Старонка 4

«Яго вобраз — бесцырымонны, надакучлівы і дурнаваты палітык, які гаворыць на трасянцы». **Старонка 5.**

# Вы пад кантролем

Лукашэнка падпісаў прыгожа ўпакаваны ўказ аб інтэрнэце.

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт». Канчатковая версія розніцца ад праекта, што трапіў у незалежныя СМІ. Але захоўвае яго дух.

1 лютага Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ №60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт». Праект указа трапіў у Рэдакцыю «НН» яшчэ ў снежні 2009 года. Ён выклікаў трывогу: прапісаныя ў праекце меры дазвалялі выкарыстаць указ для ўціску незалежных інтэрнэт-выданняў у перадвыбарны год.

**Працяг на старонцы 8.**




**Пакуль Ctrl, а не Delete.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Кацярына Аўтуховіч: «Мой тата — не тэрарыст»

Інтэрв'ю з дачкой вязня нумар 1. **Старонка 3.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

**У панядзелак у Мінску выпала 40% месячнай нормы ападкаў. «На прадпрыемствах і ў арганізацыях сталіцы можна было б аб'явіць у некаторай ступені суботнік», — сказаў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр Барысенка. У выніку на вуліцах горада можна было назіраць вось такую карціну: жанчына ў футры шуфлем прыбірае снег.**

# Скрадзенае жыццё Вітальда Глінскага

Галівуд зняў блакбастэр «Дарога дадому», у аснове якога — неверагодны лёс беларуса з Глыбоччыны.

Вясной у пракат выйдзе галівудскі фільм «Дарога дадому» (The Way Back) з Колінам Фарэлам і Эдам Харысам. У аснове сюжэта — неверагодная гісторыя ўцёкаў вязняў ГУЛАГа праз Манголію, пустыню Гобі і Гімалаі ў Індыю. Сцэнарый напісаны паводле кнігі Славаміра Равіча, ураджэнца Пінска. Яго «Доўгае падарожжа» (The Long Walk) пабачыла свет у Лондане ў 1955 годзе і было перакладзенае на дзясяткі моў.



**Праўда пра Славаміра Равіча адкрылася толькі пасля яго смерці.**

Адным з тых вязняў, што збеглі з якуцкага лагера, быў, паводле кнігі, сам аўтар. Равіч піша, што пазней ён уступіў у армію Андэрса, ваяваў у Іране і Егіпце, а пасля вайны асеў у Вялікабрытаніі.

Там аўтар бестселера памёр у 2004 годзе. А праз два гады грымнуў скандал: выявілася, што гісторыя была спісаная Равічам. Насамрэч з лагера ўцякаў іншы беларус — ураджэнец Глыбоччыны Вітальд Глінскі.

Ён зараз жыве ў англійскім графстве Корнуэл на марскім узбярэжжы. Прасты чалавек, які ўсё жыццё будаваў аўтастрады. Толькі выпадкова праўда пра яго лёс выйшла на паверхню: сам Глінскі ніколі не даводзіў, што насамрэч ён, а не Равіч, герой «Доўгага падарожжа». Вітальд хацеў забыць увесь гэты жах. Падрабязнасцяў паходу праз Гімалаі не ведала нават яго жонка Джойс.

Сям'ю Вітальда арыштавалі ў Глыбокім у 1939-м, пасля прыходу савецкай улады. 16-гадовы хлопец атрымаў 25 гадоў лагера.

**Працяг на старонцы 9.**

# Каліноўскі — усё ж Кастусь, а не Вінцэнт

Доказы знайшоў гісторык Алесь Смалянчук.

У выдавецтве «Лімарыус» выйшла кніга памяці літаратуразнаўцы Генадзя Кісялёва «... Пачуць, як лёсу валяцца муры».

У ёй — поўная бібліяграфія даследчыка, успаміны пра яго і артыкулы, сугучныя тэмам, з якімі ён працаваў.

Для кнігі напісалі тэксты Адам Мальдзіс, Арсень Ліс, Міхась Тычына, Віталь Скалабан, Мікола Хаўстовіч, Язэп Янушкевіч, Сяргей Запрудскі... Уклалі кнігу дачка вучонага Лія Кісялёва і даследчык літаратуры Аляксандр Фядута.

Ёсць у кнізе частка, у пэўным сэнсе, спракаваная Генадзем Кісялёвым. Гэта шэраг артыкулаў, прысвечаных гісторыі XIX — пачатку XX стагоддзя, пабачанай праз архіўныя крыніцы. Найбольшым знаўцам гэтага перыяду быў Генадзь Кісялёў («Кротус Генус», як жартам называў яго Караткевіч). Даследчык — без перабольшання — вярнуў тое стагоддзе беларускай гісторыі.



**...Пачуць, як лёсу валяцца муры: Памяці Генадзя Кісялёва.** — Мінск: «Лімарыус», 2010

Алесь Смалянчук публікуе дакументы, якія прэтэндуюць на сенсацыю і дапамогуць паставіць кропку ў доўгай спрэчцы, як усё-такі звалі Каліноўскага — Вікенцій ці Канстанцін? Гэта лісты сваячак Каліноўскага да яго, у якіх яны называюць яго выключна Канстантам.

Уладзімір Мархель друкуе пакаянны ліст Адама Кіркора да сына Аляксандра Мураўёва, сына Мураўёва-вешальніка. Зміцер Матвейчык — лісты палітэмігранта Міхала Ходзькі. Аляксандр Фядута — лісты Булгарына Кіркору, якія сведчаць, што ў XIX ст. у Пецярбургу існавала ліцвінска-польская літаратурная і журналісцкая «мафія». Яе ўдзельнікі падтрымлівалі, прасоўвалі адзін аднаго ў імперскай сталіцы.

Кніга будзе цікавая як шанавальнікам творчай спадчыны Генадзя Кісялёва, так і шырокаму колу зацікаўленых гісторыяй і літаратурай чытачоў.

Выданне кнігі стала магчымым дзякуючы Літоўскаму пасольству і Польскаму інстытуту.

**Сяргей Мікулевіч**

## Выйшаў «ваенны» ARCHE



Свежы нумар ARCHE прысвечаны вайне міфаў і амбіцыяў у айчыннай гістарыяграфіі.

У нумары вы знойдзеце таксама параўнанне эканамічнай палітыкі Лукашэнкі і Чаўшэску, выкрыццё фальшывых абліччаў гісторыі, матэрыялы справы сексота «Кастуся» — Сакрата Яновіча — і новыя вершы Уладзіміра Арлова. Нумар выйшаў на ўсе густы, зусім як у старыя-добрыя часы.

**Алесь Пілецкі**

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

### Самі заплаціце!

**Грэцыя просіць Еўрасаюз даць краіне тэрміновую дапамогу для барацьбы з гіганцкім дэфіцытам бюджэту.** Прэм'ер-міністр краіны трымаецца сацыялістычнага светапогляду і таму не збіраецца абразаць сацыяльныя выплаты.

Неяк адразу пацягнула роднаснасцю душ. Трымайцеся, браты па халяве! Беларусы з аптымізмам сочаць за вамі!

Грэцыя — Еўропе,
Беларусь — Расіі:
гэта вы на шопінг
самі запрасілі.

Ну, а зараз, брацця,
воду не муціце —
за харчы і плацце
самі заплаціце.

**Кнехт, Мінск**

### Чатыры градусы ў класе

На тым тыдні ў класе быў рэкорд — чатыры градусы цяпла. З трынаццаці маіх другакласнікаў на ўрокі хадзіла пяць.

Працую ў школе трыццаць гадоў. Усякія бывалі зімы. Але такога, як сёлета, не магу прыгадаць. Нават у перабудову і першыя гады незалежнасці, калі была нішчымніца, установы адукацыі ацяплялі лепей.

На мінулым тыдні ў класе быў рэкорд — чатыры градусы цяпла. З трынаццаці маіх другакласнікаў на ўрокі хадзіла пяць. Ды і гэтых як вучыць, калі ў іх насы сінія ад холаду? Якая будзе якасць адукацыі?

І колькі ў раёне такіх старых нерамантаваных школ, як наша. А колькі іх па краіне?

Скардзімся — толку няма. А забі трывогу — цябе саму зробяць вінаватай.

Нават праверка з міністэрства да нас не едзе такім марозам. Як змогуць праверальшчыкі патрабаваць нешта ад настаўніка, калі ён у такіх умовах працуе?

**Алена К., Пастаўскі раён**

**Іншыя лісты — старонка 10.**

## СЦІСЛА

### Хоць сакавік будзе ў норме

Паводле Гідраметэацэнтра, у сакавіку сярэднямесячная тэмпература прагназуецца на 0,5 градуса вышэй за норму, а норма для сакавіка — ад плюс 1 градуса на паўднёвым захадзе краіны да мінус 3 градусаў на паўночным усходзе. Апошнія 17 гадоў сярэдняя тэмпература ў сакавіку была вышэйшай за звычайную на 3—6 градусаў.

Студзень і люты сёлета намнога халаднейшыя за норму.

### Сацыяльнае аб'яднанне Алеся Міхалевіча не зарэгістравалі

Мінюст, мабыць, так і не здолеў «вызначыць мэты ініцыятывы арганізацыі і адпаведна даць ацэнку практычнай дзейнасці, якую прапаноўвае ажыццяўляць Сацыяльнае грамадскае аб'яднанне А.Міхалевіча». Згодна з Статутам — гэта аб'яднанне сацыяльнага характару, якое ставіць за мэту вырашэнне сацыяльных праблем грамадства, у тым ліку праблем моладзі.

### Экспарт упаў на 35%

Адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі за 2009 год склала 7 млрд 281,4 млн даляраў. За мінулы год экспарт знізіўся на 34,7% да 21 млрд 282,2 млн даляраў, імпарт — на 27,5% да 28 млрд 563,6 млн даляраў.

**ЗП; СМ**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перakазу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

А.П., В.Т., А.П., Л.Л., Станіславу С. са Жлобінскага раёна.
А.Ш., В.А., Сяргею С. з Баранавіцкага раёна.
Сяргею К., Т.К., В.М. са Смалявіцкага раёна.
А.С. з Мазырскага раёна.
Міхаілу Т. са Слуцкага раёна.
Мікалаю Х., Міхаілу Б., Дзмітрыю П. з Гомеля.
М.Б., А.С., Н.К. са Светлагорскага раёна.
Уладзіміру Л., Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёна.
Ганне Р. з Валожынскага раёна.
Андрэю Б. з Ваўкавыскага раёна.
Аляксандру П., Уладзіміру М. з Брэста.

# Працэс Аўтуховіча будзе адкрытым

**8 лютага спаўняецца год, як за кратамі знаходзіцца вязень сумлення Мікалай Аўтуховіч.**

Арыштоўваць яго на Гродзеншчыну прыехала група аператыўнага рэагавання «Алмаз». Мікалая Аўтуховіча, а таксама Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку схапілі і змясцілі ў мінскае СІЗА на Валадарскага.

Спачатку яны праходзілі па крымінальнай справе аб падпалах дамоў мясцовых міліцыянта і падаткавіка. Падпалы адбыліся некалькі гадоў таму, па справах ёсць асуджаныя, якія знаходзяцца ў турме. Бліжэй да лета стала вядома, што ваўкавысцам «шыюць» яшчэ і тэрарызм.

Аўтуховіча абвінавацілі ў падрыхтоўцы тэракту супраць тагачаснага старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі, а таксама намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко. Па чутках, у турму да Аўтуховіча асабіста прыходзіў Саўчанка, які абяцаў «згнаіць» прадпрымальніка.

У жніўні 2009 года на волю нечакана выпусцілі Юрыя Лявонава. У кастрычніку з яго знялі ўсе абвінавачванні. З'явілася асцярожная надзея, што следам выйдуць і астатнія. Не. Чаго крывіць душой: многія падумалі, што Лявонаў мог сведчыць супраць таварышаў. Але ён катэгарычна абвяргае такія чуткі. «Я не прадаваўся мянтам», — грубавата кажа Лявонаў.

Аўтуховіч кажа, што яго «пасадка» — помста мясцовых чыноўнікаў за яго антыкарупцыйную дзейнасць. За час знаходжання ў турме ён правёў рэкордную 90-дзённую галадоўку, патрабуючы змяніць яму меру стрымання. Трымаўся толькі дзякуючы глюкозавым кропельніцам у турэмнай бальніцы. Цяпер у Аўтуховіча сур'ёзныя праблемы з зубамі. Медычнай дапамогі ён не мае.

**По чутках, у турму да Аўтуховіча прыходзіў Саўчанка, які абяцаў «згнаіць» прадпрымальніка.**

Адвакат Павел Сапелка настойвае на спыненні крымінальнай справы, але яго прапановы адхіляюцца. У студзені міжнародная праваабарончая арганізацыя Human Rights Watch прызнала Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенку вязнямі сумлення. У краіне і за мяжой праходзяць акцыі салідарнасці з арыштаванымі.

Міністр унутраных справаў Анатоль Куляшоў паведаміў, што справа ваўкавысцаў будзе разглядацца ў Вярхоўным судзе ў адкрытым рэжыме. «Калі б не было дастаткова доказаў, то ніхто б не ўзяў на сябе смеласць перадаваць справу ў суд», — лічыць А.Куляшоў.

Калі пачнецца разгляд справы — невядома. Утрыманне пад вартай Аўтуховіча і Асіпенкі падоўжана да канца лютага.

**Зміцер Панкавец**

**Лявонаў з'ехаў**

Вызвалены летам Юры Лявонаў з'ехаў працаваць у Польшчу. Цяпер ён жыве ў невялікім гарадку Сахачаў, што ў Мазавецкім ваяводстве. Працуе ў транспартным прадпрыемстве «ARTEX Transport».

## Кацярына Аўтуховіч: Мой бацька не тэрарыст

**Гутрка з дачкой Мікалая Аўтуховіча, студэнткай першага курса факультэта кіравання Варшаўскага ўніверсітэта.**



**«Наша Ніва»: Кацярына, як перанеслі гэты год?**

**Кацярына Аўтуховіч:** Гэта год пакутаў і перажыванняў. Столькі часу прайшло з моманту арышту майго бацькі, але ніякіх зменаў у справе няма. Здаецца, што следства так і засталося на тым самым месцы, дзе было.

**«НН»: Як сустрэлі навіну пра арышт бацькі?**

**КА:** Для мяне гэта было шокам і абсалютнай нечаканасцю. У той час я была ў Польшчы на вучобе і часта перазвоньвалася з бацькам праз інтэрнэт. 7 лютага ў мяне дзень нараджэння. І летась бацькі, як звычайна, патэлефанавалі і павіншавалі мяне са святам. Тата паабяцаў, што назаўтра зноў патэлефануе. Але так гэтага і не зрабіў. Я не чула і не бачыла бацьку ўжо год (Аўтуховічу забараняюць спатканні з сям'ёй у СІЗА — «НН»).

**«НН»: Сям'я цяжка пераносіць арышт?**

**КА:** Вельмі цяжка. Цяжка ж не толькі тату, але і ўсім нам. За гэты год было вынесена столькі ўсяго негатыўнага, што нікому не пажадаеш. Можаце ўявіць, што мы засталіся без кармільца. Без бацькі, без мужа, без сына. Няма гаспадара.

**«НН»: А як здароўе ў Вашай мамы?**

**КА:** Кепска. Пасля ўсіх гэтых перажыванняў і слёз яе здароўе значна пагоршала. Праз гэта справамі бацькі яна займацца не можа.

**«НН»: Што Вы можаце сказаць пра абвінавачванні, што былі высунутыя Вашаму бацьку?**

**КА:** Мой бацька ніякі не тэрарыст. Затое ён можа выказаць проста ў вочы тое, што думае. Упэўненая, што менавіта за гэта ён і паплаціўся.

**«НН»: Дома часта бываеце? Адчуваеце падтрымку?**

**КА:** Праз вучобу выбрацца ў Ваўкавыск удаецца нячаста. Цяжка сказаць, ці змянілася да нас стаўленне пасля арышту таты. Але ўсё ж знаёмыя стараюцца падтрымліваць. Я ведаю, што ў Беларусі праходзіць шмат акцый салідарнасці з маім бацькам. Дзякуй усім, хто гэта робіць. Бо падтрымка яму вельмі патрэбная.

**«НН»: Ці ёсць у Вас нейкі прагноз наконт суда?**

**КА:** Будзем спадзявацца на лепшае.

**Гутарыў ЗП**

## Міністра Куляшова дапытвалі па «паляўнічай справе»

**У гэтым міністр унутраных справаў прызнаўся журналістам на прэс-канферэнцыі 28 студзеня.**

Пра гэту крымінальную справу «НН» пісала ў №31 за 2009 год. Яна была заведзеная на групу міліцыянтаў з Гомельскай вобласці. У ёй фігуруюць былыя начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Віктар Ермакоў, начальнік УБКіЭЗ УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Малаеў, начальнік УБКіЭЗ СН УУС Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Баранаў і начальнік АБКіЭЗ Жлобінскага РАУС Леанід Мінянкоў.

Усе абвінавачваюцца ў перавышэнні ўлады (арт. 426 КК). Таксама размова ідзе пра незаконнае паляванне на рысь, якая занесена ў Чырвоную кнігу.

Справа атрымала вялікі розгалас. Сваякі арыштаваных лічаць, што такім чынам КДБ зводзяць рахункі з прадстаўнікамі МУС за антыкарупцыйныя расследаванні ў асяроддзі чэкістаў. Анатоль Куляшоў кажа, што супрацьстаянне між ведамствамі «не было, няма і не павінна быць».

«КДБ забяспечвае контрвыведную працу МУС. Як бы яна магла адбывацца, калі б існавала супрацьстаянне. Ніякіх дадзеных, што гэтая крымінальная справа была заведзеная незаконна, няма. Усё адбываецца ў рамках заканадаўства. Вярхоўны суд павінен вынесці справядлівае рашэнне», — сказаў А.Куляшоў.

Пракаментаваў міністр і нядаўнія скандальныя выказванні былога капітана МУС Вячаслава Дудкіна.

«Дудкіна ніхто не шукае. У пошукавых базах яго няма. Хай каментары, што ён раздае, застануцца на ягоным сумленні», — сказаў міністр.

**ЗП**

## У выбарчых камісіях ізноў усе «свае»

**Ад Партыі БНФ не ўключылі ніводнага чалавека!**

Скончыўся першы этап мясцовых выбараў, якія прызначаныя на 25 красавіка. Былі сфарміраваныя тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі.

Прадстаўніцтва апазіцыі ў іх мізэрнае. З апазіцыйных партый найбольш сяброў змог правесці «Справядлівы свет» — 9 чалавек, гэта крыху меней за палову ад заяўкі. З 14-ці сяброў АГП прайшло толькі 4, з васьмі сяброў БСДГ — толькі 2. Ніхто не трапіў ад Партыі БНФ. Ад незарэгістраванай БХД у камісіі трапіла два чалавекі: у Глыбокім і Паставах.

Прадстаўніцтва палітычных партый у тэрытарыяльных камісіях складае 1%. Найбольш у іх прадстаўнікоў праўладнай Камуністычнай партыі — ажно 75.

Затое 34% людзей у камісіях — гэта сябры лукашэнкаўскіх грамадскіх аб'яднанняў: «Белая Русь», БРСМ, Саюз ветэранаў.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Рачкоўскі: Самая спакойная і цывілізаваная мяжа з краінамі Прыбалтыкі і Польшчай

Пры гэтым старшыня памежнага камітэта паведаміў, што на мяжы з Еўрасаюзам усё ж існуе праблема нелегальнага правозу з Беларусі цыгарэтаў. Самай жа праблемнай з'яўляецца мяжа з Украінай, дзе адбываецца 40% усіх затрыманняў.

### Анатоль Куляшоў: Выбух 3 ліпеня будзе раскрыты

«Справаў, якія немагчыма раскрыць, няма. Ідзе праца. Пройдзе час, і мы яго раскрыем. Вы ў гэтым пераканаецеся», — зазначыў міністр унутраных справаў А.Куляшоў.

### «Люблю Беларусь»

Замест вулічнай акцыі, на Дзень святога Валянціна «Малады фронт» будзе ўпершыню ўручаць прэмію «Люблю Беларусь». Прэміі будуць уручаныя ў намінацыях «Культура», «Спорт», «Журналістыка» і іншых.

**ЗП**

# Ці ўпадзе еўра ніжэй?

**За апошнія дзесяць дзён еўра патаннеў больш чым на 70 рублёў. Што стаіць за падзеннем валюты і якія перспектывы яна мае?**

Лёс еўра залежыць ад таго, як Грэцыя будзе выходзіць з найскладанейшага фінансавага стану. Краіна трапіла ў даўгавую яму — сёлета яна мусіць выплаціць 54 мільярды еўра альбо аб'явіць дэфолт. Урад абяцае знайсці грошы і разлічыцца па пазыках, але фінансавыя рынкі бачаць сітуацыю нашмат больш песімістычна.

### Сацыялізм перадусім

Палова ад усёй сумы мусіць быць выплачаная ў другім квартале 2010 года. У красавіку і траўні краіна мусіць аддаць па 12 мільярдаў еўра. «Наступныя шэсць месяцаў будуць мець вырашальнае значэнне. Яны стануць выпрабаваннем для нас і, на міжнародным узроўні, для нашага добрага імя», — сказаў прэм'ер-міністр Грэцыі Георгіяс Папандрэу ў інтэрв'ю The Wall Street Journal.

Лідэр дзяржавы трымаецца сацыялістычнага светапогляду і таму не збіраецца абразаць сацыяльныя выплаты. «Працоўныя не будуць расплачвацца за выпраўленне сітуацыі. Мы не будзем замарожваць ці змяншаць заробкі», — абяцае ён.

Дзяржаўны доўг Грэцыі ўжо перавысіў 300 мільярдаў еўра. Калі ж краіне прыйдзецца аб'явіць дэфолт і адмовіцца ад выплат, моцны ўдар будзе нанесены па фінансавым сектары Еўрасаюза. Дэфолт падарве давер да еўрапейскай валюты і прынясе істотныя страты фінансавым кампаніям з усёй Еўропы.

У найгоршым выпадку Грэцыя будзе вымушаная пакінуць зону еўра, увесці нацыянальную валюту, а пасля дэвальваваць яе.

Але нават такое разгортванне падзей будзе балючым ударам па Еўропе. Мяркуецца, што найбольш адчувальным ён стане для Іспаніі і Партугаліі. Не маючы магчымасці дэвальваваць сваю валюту — краіны ўваходзяць у зону еўра, — урады будуць вымушаныя рэзка скараціць рэальныя заробкі.

### Экзамен на давер да еўра

Днямі СМІ атрымалі звесткі, што Грэцыя звярнулася па дапамогу да Кітая, што было ўспрынята як крык адчаю. А катэгарычная адмова азіятаў стала своеасаблівым вотумам недаверу з боку Пекіна. Праўда, міністр фінансаў Грэцыі абвяргае ўдзел урада ў гэтай гісторыі: «Мы не звярталіся да Кітая, і інвестыцыйны банк не меў паўнамоцтваў весці перамовы ад нашага імені». Тым не менш, цэны грэчаскіх аблігацый працягваюць падаць.

Пакуль хваляванні вакол Грэцыі працягваюцца, розніца ў цане еўра і даляра за апошні месяц зменшылася ад 1,51 да 1,38. Гэта найменшае значэнне за паўгода.

Аналітыкі прадказваюць працяг падзення еўра, бо праблема не зможа вырашыцца хутка.

Калі вялікія краіны зоны еўра — Нямеччына, Францыя — Грэцыі дапамогуць, гэта будзе ўспрынята як гатоўнасць еўрапейцаў пагадзіцца з мякчэйшымі нормамі бюджэтнай дысцыпліны ў зоне еўра. Тады еўра пакаціцца ўніз, бо стане ясна, што гэтая валюта не будзе такой прыбытковай у доўгатэрміновай перспектыве.

Калі ж Грэцыі не дапамогуць, гэта будзе сведчыць аб працягу жорсткай фінансавай палітыкі. Тады еўра зможа ўтрымацца на сваіх цяперашніх пазіцыях. Аднак еўразона пачне мяняць абсягі.

**ЯМ**

# Самыя патрэбныя і ашчадныя пакупкі мінскіх уладаў — 2010

**Лёдазалівачны камбайн за $158 тысяч — што яшчэ?**

Бюджэт Мінска на 2010 год складае каля $2 млрд. Яго можна без іроніі назваць сацыяльным — больш за 40% выдаткаў пойдзе на адукацыю, ахову здароўя, культуру і спорт. Напрыклад, адукацыя запатрабавала $385 мільёнаў (19% бюджэта), на ахову здароўя $381 мільён. Мінская культура разам з мінскім спортам ацэньваюцца ў $76 мільёнаў (4%).

Варта ўдакладніць, што выдаткі на міліцыю, армію і КДБ вылічваюцца з рэспубліканскага бюджэту і на мясцовым узроўні не ўлічваюцца.

### Ад агульнага — да прыватнага

Цікавасць уяўляе спіс «невытворчага абсталявання і прадметаў працяглага выкарыстання». Праўда, ён мае відавочны недахоп для дэталёвага аналізу. Дзясяткі пакупак уключаюцца ў адну лічбу. Напрыклад, Мінгарвыканкам замовіў сабе камп'ютары, наборы мэблі, дываны, маршрутызатар, сервер рэзэрвовага капіравання, камп'ютарную інфармацыйную сістэму, сканеры, жалюзі ў ратушу, праграмна-апаратны комплекс і абсталяванне для правядзенняў пасяджэнняў выканкама на суму ў $140 тысяч. Здаецца, зашмат, але чагосьці канкрэтнага, каб абурыцца, не вылучыш.

Але сустракаюцца і яснейшыя пазіцыі. Адміністрацыя Першамайскага раёна не стала прасіць у бюджэтнага Дзеда Мароза доўгі спіс падарункаў. Лаканічна і проста: патрэбныя камп'ютар (1 шт.), кандыцыянер (1 шт.) і ксеракс (таксама 1 шт.). У выніку на тры пакупкі выдзеленыя 20 мільёнаў рублёў ($7 тысяч).

Няхітрыя падлікі: кандыцыянеры ў інтэрнэт-крамах на партале shop.by каштуюць ад $156 за самую прымітыўную мадэль да $1560 за самую дарагую. Няма сумневаў, што саграваць раённую адміністрацыю трэба па найвышэйшым разрадзе. Купляем і ідзём далей. Самы круты камп'ютар, каб у вольны час чыноўнікі маглі б пагуляць у высокатэхналагічныя стралялкі, абыдзецца бюджэту ў $2000. Такім чынам, нават пры такіх падліках на ксеракс застаецца як мінімум $3440. Ці не задорага?

### Камбайн за $158 тысяч

Але што праблемы чыноўнікаў у параўнанні з пакутамі хакейнага клуба «Юнацтва-Мінск» без новага лёдазалівачнага камбайна?! Яго купіць абавязковага. Абыдзецца гэта бюджэту ў $158 тысяч.

Ці шмат мінчан хацелі б, каб іх падаткі ішлі на набыццё такога апарата? Варта ўдакладніць, што 37% прыбыткаў бюджэту складаюць падаткі фізічных асобаў. Так што можна лічыць, што $57 тысяч на лёдазалівачны камбайн сабралі гараджане.

Трывала прымацаваўся да сталічнага бюджэта футбольны клуб «Мінск». Апроч звычайнай спонсарскай дапамогі, яго будынак сёлета збіраюцца адрамантаваць, замяніўшы вентыляцыю, і нават давесці да ладу тамбур. Агульны кошт рамонтных прац — $210 тысяч.

### План на год — $21 мільён штрафаў

Калі ўжо гаворка зайшла пра напаўненне бюджэту, можна адзначыць экстрасенсорныя навыкі чыноўнікаў. Напрыклад, яны загадзя ведаюць, што штрафаў будзе сабрана на $21 мільён. А іх здольнасці да вядзення перамоваў даюць гарантыю, што ахвяраванняў будзе атрымана на $460 тысяч — ні больш, ні менш.

Колькі слоў пра прыярытэты Мінгарвыканкама. Суседнімі радкамі ў ім ідуць выдаткі на рэстаўрацыю Свята-Петрапаўлаўскага сабора і замена шклопакетаў у будынку Мінгарвыканкама з боку вул. Свярдлова. Будынак з «боку вуліцы Свярдлова» цягнецца 50 метраў. Тым больш што патрабуецца — увага — замена (!) шклопакетаў. Відаць, старыя чыноўнікам чымсьці не падабаюцца. Карацей, да лічбаў. Шклопакеты ў офісны будынак — $88 тысяч. Сабор — $70 тысяч.

**Ягор Марціновіч**

## Duty Free вяртаюцца

З 1 ліпеня на памежныя пераходы вяртаюцца Duty Free. Гэта звязана з уступленнем у сілу пагадненняў па Мытным саюзе.

Старшыня памежнага камітэта Беларусі Ігар Рачкоўскі мяркуе, што ўсе падобныя крамы павінны быць ва ўласнасці дзяржавы. Чыноўнік прывёў прыклад невялічкага гандлёвага пункта на мяжы з Украінай, дзе грашовы абарот за дзень складаў блізу 15 тысяч еўра. Пры гэтым памежны пункт за дзень праходзіла чалавек дваццаць.

Старшынямі мытнага і памежнага камітэтаў было прынятае рашэнне на некаторы час прыпыніць працу Duty Free, каб разабрацца ў сітуацыі. Цяпер крамы Duty Free працуюць толькі ў аэрапорце. Астатнія ж крамы на памежных пераходах працуюць як звычайныя.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Стаўка рэфінансавання — уніз

Нацбанк Беларусі плануе знізіць стаўку рэфінансавання да 12% гадавых да 1 ліпеня гэтага года. Цяпер яна складае 13,5%. Аўтаматычна будуць паменшаныя стаўкі крэдытаў і ўкладаў.

### Больш не дадуць

Расія катэгарычна адмаўляецца павялічваць беларускую долю даходаў Мытнага саюза. Пакуль мяркуецца, што наша краіна атрымае ўсяго 5% агульных даходаў. Беларусь настойвае хаця б на 5,3%.

### Гарадская электрычка

Швейцарская кампанія «Stadler» выйграла тэндэр на пастаўку цягнікоў, якія будуць выкарыстоўвацца мінскай гарадской электрычкай. Перавозкі будуць ажыццяўляцца па маршруце Чыгуначны вакзал — Ждановічы і змогуць забяспечыць падвоз гледачоў да «Мінск-Арэны» падчас хакейных матчаў.

**ЯМ**

БЕЛАРУСЬ — ЕС

# Беларусь у стане забяспечыць сябе рэсурсамі, не будуючы АЭС

Канферэнцыя па барацьбе са зменамі клімату, што адбылася ў снежні 2009 года ў сталіцы Даніі Капенгагене, месяц была навіной нумар адзін у сусветных СМІ. Былі на ёй і прадстаўнікі Беларусі.

Калі верыць навукоўцам, павышэнне сярэдняй тэмпературы на планеце больш чым на 2 градусы будзе мець незваротныя наступствы — таянне ледавікоў, паводкі, сушы і цунамі. Каб спыніць пацяпленне, у бліжэйшыя 40 гадоў неабходна скараціць парніковыя выкіды на 80% у параўнанні з 1990 г.

Прамысловыя прадпрыемствы давядзецца перавесці на новыя віды паліва. Замест вугалю і нафты выкарыстоўваць вецер, ваду альбо сонечную энергію. Старыя заводы трэба будзе альбо перабудаваць, альбо зачыніць. І ўсё гэта каштуе мільярды долараў. Ахвяраваць эканамічным развіццём дзеля высакароднай мэты пакуль мала хто гатовы.

Канчатковае пагадненне, што мусіць замяніць Кіёцкі пратакол, падпісаць не ўдалося. Дый сам тэрмін «пагадненне» замянілі на вызначэнне «згода». У дакуменце не прапісваюцца ўзгодненыя абавязкі, і ён не мае юрыдычнай моцы. Асноўныя нормы «Капенгагенскай згоды» — дамагчыся, каб да 2016 г. рост сярэднесусветнай тэмпературы склаў не больш за 1,5 градуса ў параўнанні з даіндустрыяльным узроўнем, і на 80% скараціць выкіды парніковых газаў да 2050 г.

Данія невыпадкова была абраная месцам саміту. Краіна з'яўляецца сусветным лідэрам у развіцці альтэрнатыўнай энергетыкі. Яе жыхары аддаюць перавагу ветравой і сонечнай энергіі, будуюць гідраэлектрастанцыі, перапрацоўваюць смецце, вырабляюць паліва з біямасы. Ветракі даюць 20% патрэбнай краіне электрычнасці.

У Даніі распаўсюджаныя экалагічныя аўтамабілі, аўтобусы, цягнікі. Роварам на працу дабіраецца каля 40% жыхароў сталіцы. Пашыраецца і так званы каршэрынг, сумеснае карыстанне аўтамабілямі. Праз інтэрнэт вы замаўляеце аўтамабіль, карыстаецеся ім, а потым вяртаеце на любую паркоўку, адкуль яго можа ўзяць напракат іншы сябра таварыства «share-a-car».

Заходзіла гаворка і пра беларускую АЭС. Гунар бое Олесэн, каардынатар міжнароднай арганізацыі ўзнаўляльнай энергетыкі «INFORSE-Europe», адзначыў падчас канферэнцыі, што Беларусь у стане забяспечыць сябе рэсурсамі, не будуючы АЭС. Эканамічны аналіз, праведзены гэтай арганізацыяй, паказаў, што выкарыстанне рэсурсаў біямасы і энергіі ветру абыдзецца Беларусі нашмат танней, чым эксплуатацыя атамнай электрастанцыі.



# Нафтавае замірэнне на ўмовах Расіі

Расійскі віцэ-прэм'ер Сечын лічыць, што дабіўся свайго.

Перамовы двух віцэ-прэм'ераў — Уладзіміра Сямашкі з боку Беларусі і Ігара Сечына з боку Расіі — аб пастаўках нафты скончыліся 27 студзеня. З відавочным поспехам расійскага боку.

Аб'ём бязмытных паставак для Беларусі складзе 6,3 млн тон штогод. Астатняе краіна атрымае па рынкавых цэнах, выплачваючы 100% мыта. Такую прапанову Расія зрабіла яшчэ месяц таму, а ўсе далейшыя спробы беларусаў патаргавацца пакідала без увагі. Якую суму пры гэтым дадаткова заплаціць Беларусь? Больш за $2 млрд за год.

### Кампенсацыі

У гэтым цэбры дзёгцю ёсць пару лыжак мёду. Па-першае, нафта, пастаўленая на беларускія перапрацоўчыя заводы, а пасля экспартаваная назад у Расію ў выглядзе нафтапрадуктаў, таксама не будзе абкладацца мытам. Хоць плюс сумнеўны: гэта павялічыць экспартную залежнасць нашай краіны ад Расіі і скароціць беларускі экспарт у ЕС.

Па-другое, тарыф на транзіт расійскай нафты праз тэрыторыю Беларусі павялічаны. Праўда, усяго на 11%. Калі тарыф пратрымаецца да канца года, Расія даплаціць за транзіт каля $35 млн.

Але ўжо ў кастрычніку наша краіна атрымае магчымасць павялічыць тарыф яшчэ раз.

### Сямашка яшчэ вернецца

Беларускі бок у асобе Сямашкі пэўны, што дамоўленасці пра пастаўкі нафты пратрымаюцца нядоўга. «Ужо ў сярэдзіне года, пры стварэнні супольнай мытнай прасторы, мыты і квоты зробяцца нонсенсам», — растлумачыў ён.

Стала зразумела, што хавалася за ранейшай прапановай Сямашкі атрымаць ад Расіі адразу ўсе 6,3 млн тонаў бязмытнай нафты — яе хапіла б да траўня. Такім чынам, Беларусь карысталася б бясплатнай нафтай паўгода, згодна з дамоўленасцю, а пасля бясплатныя ўмовы былі б зацвярджаныя правіламі супольнай мытнай прасторы. Аднак Расія не адмовіцца ад прыбыткаў.

### Змены на рынку

Ад зменаў у сістэме паставак нафты выйграе расійскі бюджэт, а прайграе беларускі. У той жа час расійскія нафтавыя кампаніі застануцца пры сваім. Акрамя «Лукойла» і «Газпромнефти», якія мелі свае сеткі АЗС у Беларусі. Зараз давальніцкая перапрацоўка нафты на беларускіх заводах для патрэб гэтых заправак зробіцца выключна стратнай. Беларускі ўрад абмяркоўвае новыя схемы загрузкі заводаў. Не выключана, што ўвесь бязмытны аб'ём пойдзе праз дзяржаўную «Беларуснефть».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Беларусь імпартуе нафту толькі з Расіі.**

Ахвярай перадзелу стала і кампанія «Трайпл» на чале з блізкім да Лукашэнкі Юрыем Чыжом. У мінулым годзе яна паставіла ў Беларусь каля 1,5 млрд т нафты. Страта прыбыткаў балюча на ёй адаб'ецца: яна ўжо адраклася ад праекта пабудовы біятлоннай трасы ў Сочы да Алімпіяды.

### Забрацца пад крыло

На гэтым тыдні расійскі куратар нафтавага пытання Ігар Сечын мае наведаць Беларусь, каб абмеркаваць развіццё супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы. З ягоных словаў, бакі маюць падпісаць пагадненні аб «доўгатэрміновым супрацоўніцтве ў газавай сферы, электраэнергетыцы, аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Беларусі».

Расія дабіваецца поўнага і стратэгічнага кантролю над энергетыкай Беларусі. Заключаныя ў Маскве дамовы яшчэ мацней прывязваюць Беларусь да расійскіх крыніцаў энерганосьбітаў.

У выпадку пабудовы АЭС Расіяй залежнасць стане татальнай і ў электраэнергетыцы.

**ЯМ, Сяргей Гезгала**

# Першы канал пачаў прасаваць Лукашэнку

Нафтавая вайна зрабіла беларускага кіраўніка галоўным аб'ектам кпінаў на расійскім тэлебачанні. Піша **Ягор Марціновіч**.

Новы праект Першага канала — «Мультасобы» — нагадаў гледачам дэмакратычныя 1990-я. Тады НТВ-шныя «Лялькі» маглі на ўсю краіну смяяцца і з прэзідэнта, і з прэм'ер-міністра, і з астатніх палітыкаў. З'яўляліся ў эфіры і пароды на зорак шоу-бізнэсу, але ўвага факусавалася на грамадскіх дзеячах — смешных, недасканалых. Асабістая крыўда Пуціна выклікала закрыццё перадачы ў 2002 годзе.

Сатыра ўваскрэсла праз сем гадоў на іншым тэлеканале. Праўда, цяпер дазволена смяяцца толькі з артыстаў і замежных палітыкаў. Кранаць сваіх — непажадана. Пуцін і Мядзведзеў з'явіліся ў «Мульце» толькі каб праспяваць бяскрыўдную навагоднюю песеньку і папярэдзіць Юшчанку, што «у вас огонь погас — это раз».

Жабракі Цімашэнка з Юшчанкам, бабнік Берлусконі і падабцаснік Сарказі — вось новыя героі расійскай сатыры. А з цягам разгортвання нафтавага канфлікту пад прыцэл трапіў і Лукашэнка. Яго вобраз — бесцырымонны, надакучлівы і дурнаваты палітык, які гаворыць на трасянцы.

Вось Лукашэнка ўпрошвае Мядзведзева пакатаць яго на прэзідэнцкім лімузіне. Вось спрабуе прадаць трактар Берлусконі і Хілары Клінтан, псуючы ім спатканне. Вось ён ідзе «даваць свінням».

Паводле сюжэта апошняй перадачы, у гульні «Хто хоча стаць мільянерам?» персанаж Лукашэнка падманам выйграе галоўны прыз. Яго фразы можна разбіраць на цытаты: «Давайце не 50 на 50, а 98 на 2! Я так прывык!» ці «Не трэба бацьку пужаць! Бацька пужаны! Бацька на трактары перакульваўся!»

Перадача выйшла падчас нафтавых перамоваў. А адразу пасля іх тую самую ідэю — Лукашэнка гуляе ў «Мільянера» — выкарысталі ў іншай гумарыстычнай перадачы таго ж канала, «Вялікай розніцы». Эпізод, дзе персанаж Лукашэнка несумленна выйграе тры мільёны расійскіх рублёў, у Беларусі не паказалі — выразала цэнзура.

Расійскі Першы канал прасуе Лукашэнку, нібыта хоча сказаць сваім гледачам: звярніце ўвагу, хто фактычна крадзе нашы, расійскія грошы.

...Нафтавая праблема, здаецца, вырашаная. Цікава, каго крэмлёўскія ідэолагі прызначаць наступнай «ахвярай» сатырычнага тэлебачання?

КАМЕНТАР

# Данайская нафта Расіі

По паняцiях жаніха, раз ты цалавалася, мусіш з ім класціся. Піша **Барыс Тумар**.

Расійскі аналітык Андрэй Суздальцаў любіць выстаўляцца тым, як велікадушна Расія дапамагае Беларусі, і многія беларускія інтэрнэт-СМІ захоплена зазіраюць яму ў рот. Ягоныя словы ўгрунтаваныя на вялікай традыцыі.

Расійскі гістарычны, культурны і палітычны наратыў на тым стаіць: Расія была імперыяй, але высакароднай. У адрозненне ад усіх іншых імперый, яна захоплівала землі не для эксплуатацыі, а для асветы і дапамогі.

На адной з канферэнцый Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Суздальцава бліскуча асадзіла прафесарка Гарвардскага ўніверсітэта Маргарыта Бальмасэда. «Расія субсідуе Беларусь!» — прыгаворваў выдалены з Беларусі палітолаг. «Расія ўкладае любыя грошы, каб толькі застацца манапольным пастаўшчыком энерганосьбітаў Беларусі, што дазволіць у будучыні атрымліваць неабмежаваныя дывідэнды», — адказала яму Бальмасэда.

Нафта ў абмен на пацалункі. Але па паняцiях жаніха, раз ты цалавалася, мусіш з ім класціся.

Сечынская саступка — нафта, якая будзе пастаўленая на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы, а пасля экспартаваная назад у Расію ў выглядзе нафтапрадуктаў, таксама не абкладаецца мытам — з разраду данайскіх дароў. Такім чынам скароціцца беларускі экспарт у ЕС і вырасце — на ўсход.

Лукашэнка смелы, калі ваюе са студэнтамі на вуліцах і пенсіянеркамі з Саюза палякаў. Але Маскве ён пятнаццаць гадоў робіць саступку за саступкай. Прадаў мову, прадаў сцяг, прадаў войска. І на шаснаццатым годзе ягонага пышнага кіравання энергазалежнасць Беларусі ад Расіі паўзе да 95%. Брава, бясстрашны лідэр.

## МВФ: Вылучэнне новых крэдытаў залежыць ад тэмпу структурных рэформаў

МВФ убачыў пэўную зацікаўленасць беларускіх уладаў у новай праграме stand-by і агучыў дзве галоўныя ўмовы, ад якіх будзе залежаць выдзяленне новых крэдытаў Беларусі.

«...Перш за ўсё, ад неабходнасці дадатковага фінансавання і ад жадання ўладаў працягнуць адносіны з МВФ, уключаючы паскарэнне структурных рэформаў», — сказала прадстаўніца МВФ у Беларусі Наталля Калядзіна, словы якой цытуе Interfax.by.

**СГ**

# Канфлікт культуры і рэлігіі

**У Раўбічах на будынак касцёла, у якім месціцца музей, прэтэндуе каталіцкая парафія.**

Таварыства аховы помнікаў накіравала лісты пратэсту мітрапаліту Тадэвушу Кандрусевічу і ў Саўмін. У іх паведамляецца, што рымска-каталіцкая парафія з вёскі Аколіца Мінскага раёна пачала несанкцыянаваныя працы на тэрыторыі Музея беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах, будынак якога ахоўваецца дзяржавай.

### Антон Астаповіч: вернікам трэба капліца

У лісце Таварыства адзначаецца, што побач з будынкам быў усталяваны крыж, вакол могілак узведзеная агароджа, пачалося будаўніцтва парафіяльнага дома, ссечаныя старадаўнія ліпы.

Старшыня Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч падкрэслівае каштоўнасць музея як аднаго з цэнтраў папулярызацыі беларускай культуры.

Ён прапануе зладзіць круглы стол, каб вырашыць, дзе збудаваць капліцу для вернікаў парафіі з в. Аколіца.

### Айцец Лашук: музей хоча захаваць працоўныя месцы

На думку ініцыятара зменаў, айца Ігара Лашука, прэтэнзіі музейшчыкаў надуманыя. Вернікі афармілі ўсю неабходную дакументацыю і атрымалі дазвол Мінкульта на будаўніцтва парафіяльнага дома на месцы колішняй плябані. А потым у справу ўмяшалася кіраўніцтва Мастацкага музея. «Музейнае кіраўніцтва любым спосабам хоча захаваць свае працоўныя месцы. Мы лічылі, колькі чалавек наведвае той музей. У пятніцу, суботу і нядзелю некалькі чалавек заходзіла. Некаторыя казалі, што палічылі будынак музея касцёлам», — кажа ксёндз.

Ён не хавае, што канчатковая мэта парафіі — вяртанне будынка: «Богу — Богава. Музей можна размясціць у любым памяшканні».

Лёс сённяшняга будынка музея ў Раўбічах характэрны. Былы касцёл Св. Мацвея, збудаваны ў 1862 г., у 1866 г. быў перададзены праваслаўнай царкве, у 1920 годзе вернуты каталікам, за саветамі зачынены. У час Другой сусветнай храм быў моцна пашкоджаны. У 1970-я рэшткі касцёла апынуліся на тэрыторыі алімпійскага спарткомплексу «Раўбічы». Яго адрэстаўравалі і прыстасавалі пад Музей народнага мастацтва, філіял Нацыянальнага мастацкага музея. Завязаныя ў час саветызацыі вузлы цяжка разблытаць і сёння.



**Сямён Печанко**

КРЫМІНАЛ

## Пасля адстаўкі Саўчанкі ў Гродне разгарэўся зямельны скандал

**АБЭЗ Гродна зацікавіўся абставінамі выдзялення ўчасткаў зямлі коштам паўмільёна даляраў. Пад ударам апынуліся кіраўнікі гар- і аблвыканкама.**

Гаворка ідзе пра два рашэнні гарвыканкама, згодна з якімі СТАА «Фірма таксапарк» атрымала ў карыстанне два ўчасткі зямлі ў цэнтры горада. Першае рашэнне было прынятае ў лістападзе 2001 года, другое — у лютым 2004-га. Акурат калі Гродзенскай вобласцю пачаў кіраваць Уладзімір Саўчанка. Кошт участкаў, па ацэнцы АБЭЗ, склаў больш за 1,4 млрд рублёў.

СТАА «Фірма таксапарк» аказвала транспартныя і турыстычныя паслугі, у тым ліку арганізоўвала паездкі на аўтобусе «Неаплан» у Хмяльніцкі, экскурсійныя туры, рэгулярны рэйс Гродна-Варшава-Гродна.

Рашэнні аб выдзяленні зямлі неаднойчы правяраліся і кожны раз прызнаваліся правамернымі.

Як кажуць у Гродне, уся сутнасць у тым, што рашэнне прымалася не ў гарвыканкаме. Адпаведнае распараджэнне паступала з аблвыканкама. Нібыта хтосьці з кабінета старшыні аблвыканкама меў блізкія сувязі з уладальнікамі прыватнай кампаніі. Пагаворваюць нават, што з гэтым зямельным скандалам, які АБЭЗ раскруціў у студзені, звязаная адстаўка кіраўніка вобласці Уладзіміра Саўчанкі.

АБЭЗ удалося дамагчыся адмены рашэнняў аб выдзяленні ўчасткаў як незаконных, што выводзіць скандал на прынцыпова новы ўзровень.

За 9 і 5 гадоў, якія прайшлі з часу выдзялення зямлі, на ўчастках былі ўзведзеныя аб'екты нерухомай маёмасці, з якімі зараз незразумела, што рабіць. Па-другое, сам факт прызнання рашэнняў незаконнымі кажа аб тым, што мелі месца карупцыйныя дамоўленасці.

Крымінальныя справы пакуль не распачалі.

**«Ежедневник»**

## «Літоўскі Робін Гуд» можа хавацца ў Беларусі?

Паводле літоўскага ТВЗ, паліцыя і пракуроры шукаюць людзей, якія 6 кастрычніка 2009 года перасякалі літоўскую мяжу. Высвятляюць, ці не былі яны знаёмыя з падазраваным у падвойным забойстве Драсюсам Кедзісам і ці не вывезлі яго, напрыклад, у Беларусь. Спецыялісты ў галіне крыміналістыкі расказалі, што такія дзеянні азначаюць, што паліцыя трапіла ў тупік і не ведае, што рабіць.

Кедзіса падазраюць у забойстве дзяржаўных чыноўнікаў, якім ён, нібыта, адпомсціў за гвалт дачкі. Паводле іншай версіі, Кедзіса даўно няма жывога, а чыноўнікаў забіла мафія.

**Паводле delfi.lt**

СЦІСЛА

### Пенсіянер з Рэчыцы падазраецца ў педафіліі

У дачыненні да раней не судзімага мужчыны 1945 года нараджэння распачата крымінальная справа. Яго падазраюць у тым, што ад лета 2008 года да лістапада 2009 года ў сваім доме ён учыняў дзеянні сэксуальнага характару з рэчыцкімі школьнікамі 1993, 1994, 1995 гадоў нараджэння.

### У Слуцку два браты згвалтавалі трэцякласніцу

Крымінальная справа за гвалтоўныя дзеянні сэксуальнага характару ў дачыненні да заведама малалетняй распачатая ў Слуцку. Мясцовыя жыхары, 19-гадовы і 17-гадовы браты, нападпітку цэлы вечар здзекаваліся з трэцякласніцы. Яе маці некуды выйшла па справах. З'яўленню маладых людзей дзяўчынка не здзівілася, бо гэта былі знаёмыя яе маці. Цяпер ім пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

### Выкладчык спрабаваў абрабаваць банк

21-гадовы выкладчык Шапчыцкага вучэбна-педагагічнага комплексу спрабаваў абрабаваць аддзяленне «Альфа-Банка» ў Рагачове. Ён падышоў да касіра і падаў у акно аркуш з тэкстам: «У мяне пісталет. Ціха складзі грошы ў пакет і без глупстваў». Аднак, пачуўшы націсканне трывожнай кнопкі, спрабаваў уцячы. Быў затрыманы. Пісталета ў яго не знайшлі.

### У Жодзіне ў ДТЗ пацярпеў 6-гадовы хлопчык

У Жодзіне 52-гадовы кіроўца аўтамабіля «УАЗ» зрабіў наезд на 6-гадовага хлопчыка, які перабягаў дарогу па-за пешаходным пераходам, штурхаючы перад сабою санкі. У выніку хлопчык з траўмай галавы і ўдарамі быў шпіталізаваны. Ад пачатку года на дарогах краіны загінула адно дзіця, 13 дзяцей было паранена.

### Спаліў чалавека за «Аўдзі»

Абгарэлы труп 24-гадовага жыхара сталіцы з прыкметамі гвалтоўнай смерці быў знойдзены ў лясным масіве каля вёскі Курганы Мінскага раёна. Устаноўлена, што злачынства было ўчынена 22 студзеня на арандаванай кватэры па вуліцы Талбухіна ў Мінску. 21-гадовы мінчанін, каб завалодаць аўтамашынай «Аўдзі-4», задушыў яе ўладальніка, труп вывез за горад і падпаліў. Падазраваны змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

**Паводле БелаПАН**

# Украіна ў чаканні «сіняй» рэвалюцыі

**Калі ў палітыцы пануюць законы джунгляў, гэта яшчэ не дэмакратыя. Піша Вадзім Вілейта, які браў удзел у назіранні за ўкраінскімі выбарамі.**

«Ти можеш повернути на Схід і на Захід, Ти можеш повернути — але змучився гребсти». Падчас вандроўкі ў стомленую ад выбарчых баталіяў Украіну ў галаве круціцца песенька яшчэ часоў Аранжавай рэвалюцыі, якая стала прарочай. Паварочваць Украіна ўмее, але тая паваротлівасць не дае істотных дывідэндаў.

Такія блізкія гістарычна, у палітычным вымярэнні Беларусь і Украіна адрозніваюцца бы неба і зямля. У Беларусі палітыка ўвагнаная ў падполле, амаль адсутнічае. Ва Украіне — узведзеная ў абсалют як самамэта, і ад гэтай овердозы стала бессэнсоўнай і нецікавай.

Палітыка, у Беларусі дэ-факта забароненая адміністратыўна, ва Украіне — усюды, але для большасці насельніцтва яна непрывабная і недасягальная. Дорага.

## Законы джунгляў

Аўтару гэтых радкоў давялося знутры зірнуць, як ішла перадвыбарчая кампанія на берагах Дняпра — у рамках місіі праекта «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка». Як належыць замежным назіральнікам, цікавіліся, ці не ціснула дзяржава на кандыдатаў, ці не было выпадкаў пагрозаў, дыскрымінацыі і г.д.

Пытанне ўкраінцаў нават здзіўляла — яны ўжо і забыліся, што такое бывае. І не толькі ў Львове і Кіеве, але і ў глыбінцы Данецкай і Адэскай абласцей.

Хутчэй наадварот — апытаныя наракалі, што дзяржава не робіць нічога. Ігнаруе відавочныя парушэнні з боку кандыдатаў, выкарыстанне брудных грошай для «тлумлення галавы» электарату, карупцыю ў СМІ і на выбарчых участках.

Калі ў палітыцы пачынаюць панаваць законы джунгляў, гэта яшчэ не дэмакратыя. Выбары тады могуць лічыцца свабоднымі, але не будуць справядлівымі. Бо перамагае не найлепшы, а найбагацейшы кандыдат. Гэта вайна грошай — прычым такіх грошай, якія і не сніліся кандыдатам з шмат якіх краін Еўрапейскага Саюза.

Хто больш закупіць часу на ТБ, хто больш паставіць бігбордаў — той набывае псіхалагічную перавагу над праціўнікамі і пераконвае электарат: я тут самы круты.

А праграма... Ды хто яе чытае?

## Ёсць у рэвалюцыі пачатак...

Адной з найважнейшых знаходак нашай назіральніцкай місіі сталі доказы таго, што Віктар Януковіч рыхтуецца да сваёй «рэвалюцыі» — у выпадку, калі на выбарчых участках прайграе.

Не пакладаючыся на пратэстны патэнцыял свайго пераважна правінцыйнага электарату, «сінія» пайшлі на тое, каб будучую «рэвалюцыю» ў сталіцы праплочваць. Як праплочваецца амаль усё падчас гэтых выбараў.

«Праца на выбарах» — нікога не здзіўляюць такія абвесткі на расійскай мове ў кіеўскім метро. Прапануецца «пастаяць на аб'екце» ў пэўныя гадзіны сутак і атрымаць узнагароду — 75 грыўняў (каля 25 тысяч рублёў).

Нашы назіральнікі спрабавалі патаргавацца і атрымаць сотню — аказалася, можна зарабіць і столькі, але стаяць трэба даўжэй. На Хрышчатыку.

Збяднелыя людзі, якія прадаюць свае галасы ля ўчасткаў або ў інтэрнэце; чальцы выбарчых камісіяў, якія перакідваюцца да таго кандыдата, які больш заплаціць; «тэхнічныя» кандыдаты, якія працуюць на аднаго з «галоўных», і ўрэшце — купленыя «рэвалюцыянеры» — такая цана разгулу алігархічнай дэмакратыі ва ўмовах татальнай галечы.



Вялікая Айчынная «Вона».


Намёткі намётавага мястэчка ў Кіеве — супраць фальсіфікацыяў і за «честные выборы». Вынікі 1 тура «чэсныя» — таму намёты пакуль не спатрэбіліся.



«Работа на выбарах» — аб'ява ў метро.

## «Вона»

«Электарат Януковіча больш канцэнтраваны і абмежаваны па рэгіёнах Украіны, таму мае горшы патэнцыял росту, — кажа мой калега па місіі, нарвежскі палітолаг і спецыяліст па назіранні прафесар Франк Арэброт. — Юлія Цімашэнка перамагла ў большай колькасці абласцей з вынікам каля 40%, Януковіч жа перамог толькі на ўсходзе, дзе за яго галасавала да 70—75% насельніцтва вобласці (Данецкай, Луганскай)».

З улікам гэтай тэндэнцыі, а таксама галасоў, набраных іншымі кандыдатамі, палітолаг прагназуе Цімашэнцы перамогу ў другім туры.

«Хутчэй за ўсё, гэта выкліча абурэнне ў шэрагах прыхільнікаў Януковіча, і, як прыхільнікі Ючшанкі пяць гадоў таму, яны паспрабуюць узяць уладу праз «майдан», — кажа прафесар Арэброт.

«Як паказалі нашы назіранні, Януковіч быў гатовы да пратэстаў ужо пасля першага тура, але яны не спатрэбіліся, бо ён набраў адносную большасць галасоў, — працягвае нарвежац. — Аднак калі Януковіч прайграе Цімашэнцы 7 лютага, спробы «сіняй рэвалюцыі» непазбежныя».

У адрозненне ад Беларусі, вырашаць, каму дастанецца перамога ў другім туры, будуць усё ж выбаршчыкі — тыя самыя, якія ў пераважнай большасці расчараваліся ў палітыцы, але ўсё ж спадзяюцца на лепшую будучыню і на ўчасткі прыйдуць.

Аднак, як паказваюць настроі ў краіне, галасаваннем барацьба можа не скончыцца. Абодва бакі прадумляюць, як ухапіць за хвост перамогу, калі тая надумаецца выслізнуць.

Бо надта шмат мільярдаў пастаўлена на карту...

# Беларускія маркі да Алімпіяды-2010 – набор кур'ёзаў

**За Домрачавай на марцы бягуць... мужчыны-біятланісты!**

Да зімовых алімпійскіх гульняў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі ўвяло ў зварот новы паштовы блок — з маркай коштам 3 тысячы рублёў і пяцю марачнымі купонамі.

Спартыўныя заўзятары адразу ж знайшлі на выявах шэраг недарэчнасцяў.

На марцы з хакеістамі спартсмен у беларускім швэдары «апрануты» ў нагавіцы нью-ёркскага хакейнага клуба «Рэйнджэрс». Яго супернік — хакеіст канадскага клуба «Манрэаль», з якім зборная Беларусі ніколі не гуляла і гуляць не плануе.

Фрыстайліст з другой маркі яўна змаляваны з украінскага спартсмена Энвера Аблаева, але ніяк не з беларуса.

Тры ніжнія маркі прысвечаныя біятлону. На адной з іх беларуска Дар'я Домрачава страляе стоячы, у той час як яе суперніцы рыхтуюцца страляць лежачы. Такую памылку наша біятланістка зрабіла летась, што прывяло да дыскваліфікацыі. «Белпошта», відаць, вырашыла захаваць гэты момант для гісторыі.

Наступны эпізод — біятлонная пагоня. Але за Домрачавай на марцы бягуць... мужчыны-біятланісты!

Хоць, магчыма, гэтыя кур'ёзы толькі падвысяць каштоўнасць марак у вачах калекцыянераў.

**ЯМ, паводле «Прессбола»**



# Вы пад кантролем

Працяг са старонкі 1.

Пра тое, што ўказ будзе прыняты вось-вось, сведчыла многае. Дзяржаўныя СМІ цягам некалькіх тыдняў зандавалі глебу. Вядучыя і журналісты спрэс былі заклапочаныя тым, што дзеці цяпер могуць свабодна глядзець сайты з парнаграфіяй ці прапагандай гвалту. Ківалі на Нямеччыну, іншыя краіны, дзе даўно ўжо існуюць дакументы, якія рэгулююць доступ да рэсурсаў сусветнага павуціння.

«Інтэрнэт павінен рэгулявацца — гэта робяць практычна ва ўсім свеце», — такое меркаванне выказала першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч. Яна абгрунтоўвала сваю пазіцыю абаронай аўтарскіх правоў і маральнасці.

Галоўны ж ідэолаг краіны Усевалад Янчэўскі заспяшаўся пераканаць, што рэгулявання інтэрнэта на кітайскі ўзор не будзе. Дзяржава проста хоча «прысутнічаць» у сеціве. «Ніхто інтэрнэт прыкрываць не будзе. І гэта немагчыма. Гэта прымітыўныя ісціны», — зазначыў У.Янчэўскі.

Падпісаны варыянт указа не такі адыёзны, як той праект, што ў снежні трапіў у СМІ. Рэзананс, які ён выклікаў, змусіў распрацоўшчыкаў згладзіць найбольш вострыя куты. Але шраг трывожных момантаў застаўся.

Як і чакалася, рэгуляваннем інтэрнэта будзе займацца новая спецслужба Лукашэнкі — Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі прэзідэнта (ААЦ). Гэты орган і мае сачыць, каб кампаніі, якія займаюцца прадстаўленнем інтэрнэт-паслуг, дбалі пра «бяспеку» карыстальнікаў. Выглядае, што ААЦ і будзе вызначаць, якія правайдэры вартыя аказваць паслугі грамадзянам. То бок на інтэрнэт у вас дома трэба будзе віза ад Адміністрацыі прэзідэнта.

А супольна з Міністэрствам сувязі ААЦ будзе абмяжоўваць доступ да некаторых сайтаў. Такое можна было рабіць і раней. Напрыклад, калі начальнік фірмы не хацеў, каб работнікі ў працоўны час сядзелі ў сацыяльных сетках. Але гэта мела прыватны характар. Цяпер, калі той самы начальнік захоча заблакаваць яшчэ і апазіцыйныя сайты, ён зможа спаслацца на ўказ Лукашэнкі.

ААЦ абавязвае правайдэраў ідэнтыфікаваць мадэмы сваіх карыстальнікаў, захоўваць звесткі аб аказаных інтэрнэт-паслугах. То бок на патрабаванне людзей з Цэнтра правайдэр будзе вымушаны даць інфармацыю, якія сайты наведваў той ці іншы карыстальнік. Прасцей кажучы — дазваляецца адсочванне.

Ёсць ва ўказе пункт, згодна з якім правайдэр мусіць на патрабаванне карыстальніка адключыць яму пэўныя сайты. Разам з тым, ніяк не прапісана, ці гэтыя сайты будуць адключаныя і астатнім абанентам сеткі.

Прычым гаворка вядзецца не толькі пра рэсурсы, якія прапагандуюць парнаграфію і гвалт, але і пра накіраваныя «на здзяйсненне экстрэмісцкай дзейнасці». Пра тое, як у Беларусі могуць інтэрпрэтаваць паняцце «экстрэмізм», сведчыць прыклад суда над часопісам ARCHE, гістарычныя матэрыялы якога палічыў экстрэмісцкімі брэсцкі абласны КДБ.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

Асабліва трывожна з той прычыны, што ўказ падпісаны напярэдадні двух буйных палітычных кампаній — мясцовых і прэзідэнцкіх выбараў.

Утрымлівае закон і станоўчыя моманты. Як, напрыклад, рэгуляванне абароны аўтарскіх правоў у інтэрнэце. Раней гэта не было замацавана юрыдычна. Таксама інтэрнэт-крамы, што працуюць на тэрыторыі Беларусі, цяпер павінны абавязкова мець дамен «by». Эксперты кажуць, што па бізнэсе гэта ўдарыць не павінна.

Інфармацыйных сайтаў новы ўказ ніяк не датычыць. Калі прымаўся новы закон аб СМІ, справу з рэгуляваннем інтэрнэта перадалі Савету міністраў. Прайшло ўжо больш года, але ўрад так і не зрабіў ніякіх прапановаў.

«Гэты ўказ прыгожа ўпакаваны. Ёсць і некалькі пазітыўных момантаў — такіх, як абарона аўтарскага права, стварэнне і абнаўленне сайтаў дзяржпрадпрыемстваў і ўстаноў. Гэта будзе спрыяць большай празрыстасці іх працы, інфармаванню грамадскасці. «Але не варта мець ілюзій, — кажа аналітык Аляксандр Класкоўскі. — Усё, што робіцца з-пад палкі, добра рабіцца не будзе. У пункце аб сайтах дзяржустаноў іх прапануецца ствараць на расійскай і беларускай мовах, прычым беларуская ўзятая ў дужкі. Гэта дыскрымінацыя мовы. Падводныя камяні ўказа — цьмяныя пункты аб рэгістрацыі сетак і інфармацыйных рэсурсаў».

«Слізкі таксама пункт аб абмежаванні доступу па запыце карыстальніка. Існуе цэлая абойма спецслужб, якія могуць перакрываць доступ да рэсурсаў. У нашых умовах гэта можа быць сур'ёзным прэсінгам. Увогуле указ аказаўся не такі страшны — розгалас і міжнародны прэсінг яго змякчылі. Але і ён дазволіць уладам трымаць руку на горле незалежнага грамадства», — працягвае А.Класкоўскі.

Увогуле ж, шмат будзе залежыць ад таго, як гэты ўказ будзе прымяняцца, а тут фантазія можа быць шырокай. Небяспека таго, што такім чынам улады паспрабуюць заблакаваць непажаданыя для іх сайты, таксама застаецца. У сілу ўказ уступіць ад 1 ліпеня.

**Алесь Пілецкі, Зміцер Панкавец**

### «Сынишка без устали шастает по порносайтам»

Як «Советская Белоруссия» апраўдвае ўказ пра інтэрнэт.

Газета прэзідэнцкай адміністрацыі ў аўторак вынесла тэму ўказа пра інтэрнэт на першую паласу. У рэдакцыйнай падводцы пад загалоўкам «Памагай блог» яна апісвае кашмарную сітуацыю: «У аднаго дачка так «падсела» на камп'ютар, што да падручнікаў абцугамі не зацягнеш, другі наракае, што сынуля безутомку швэндаецца па порнасайтах, трэці бурчыць: страшна грошы ў банк скіраваць — кардэры абрабуюць. І ўсе ў адзін голас кажуць: «Трэба нешта рабіць».

**Мікола Бугай**

### «Распачатая спроба ўзяць пад кантроль беларускі сегмент сеціва»

Рэдактар сайта Electroname.com Фёдар Паўлючэнка заявіў: «Распачатая спроба ўзяць пад кантроль беларускі сегмент сеціва. Па вялікім рахунку, усе палажэнні нашумелага праекта патрапілі ў сам указ з той толькі розніцай, што былі прыбраныя адкрыта непісьменныя фармулёўкі. Вонкава дакумент накіраваны на «ўпарадкаванне» інтэрнэт–бізнэсу — інтэрнэт–гандлю, хостынг–паслугаў, паслугаў інтэрнэт–правайдэраў. Прадпрымальнікаў цяпер можна без рашэння суда пакараць прыпыненнем аказання інтэрнэт–паслуг. Пункты па ідэнтыфікацыі карыстальнікаў таксама прысутнічаюць. Дэ–факта ў Беларусі правайдэраў абавяжуць мець сістэму, аналагічную расійскай САВМ. Па беларускіх інтэрнэт–СМІ можа ўдарыць і «барацьба» ўлады за аўтарскія правы. На мілавіднай падставе, выкарыстоўваючы гэты ўказ, можна закрыць большасць навінавых беларускіх сайтаў. Галоўным па байнэце, як і меркавалася, прызначаецца ААЦ. Фактычна міжнародны шлюз з рук «Белтэлекама» перадалі Аператыўна–аналітычнаму цэнтру».

# Наша салідарнасць можа зрушыць горы

Патрабуецца матэрыяльная дапамога сям'і Сяргея Каваленкі. Піша **Барыс Хамайда**.

7 студзеня беларус Сяргей Каваленка ўзнёс на вяршаліну 35-метровай навагодняй ёлкі на плошчы Перамогі ў Віцебску наш бел-чырвона-белы сцяг, тым самым здзейсніўшы подзвіг, варты ўзроўню легендарнага Мірона. Гэтым мужным учынкам яшчэ раз пацверджаная старая як свет ісціна: калі любіш Беларусь — нічога немагчымага няма.

Бел-чырвона-белы сцяг толькі ўпрыгожыў віцебскую ёлку. І пакуль святы і боскі сімвал лунаў над вяршалінай — гэта была самая лепшая і найпрыгажэйшая навагодняя ёлка ў свеце.


СЯРГЕЙ СЕРАБРО

Упэўнены, што ўчынак натхніць беларускіх мастакоў, дызайнераў і вынаходнікаў распрацаваць цудоўнае ўпрыгожанне бел-чырвона-белага колеру на вяршаліну навагодняй ёлкі замест бальшавіцка-савецкай зоркі.

Антыбеларускі рэжым завёў крымінальную справу супраць Каваленкі. Агульнымі намаганнямі нам удалося вырваць з турэмных засценкаў Сяргея. Але жыццё не стаіць на месцы. Сёння, акрамя маральнай, патрабуецца матэрыяльная дапамога сям'і Каваленкі: грошы на аплату паслуг адваката. Бо невядома, колькі часу працягнецца следства, а затым разгляд гэтай палітычнай справы.

Маці Сяргея адчыніла рахункі, на якія можна перасылаць грашовыя ахвяраванні:

Філіял № 200/140 Віцебскай абласной управы АСБ Беларусбанк

МФО 150801635

УННН 300229956

Р/р 3819382103002

Каваленка Лідзія Уладзіміраўна

Асабісты рахунак 01064749

E–mail: kovalenkoelen@mail.ru

Таго, хто ахвяруецца дзеля Радзімы, нельга пакідаць на волю лёсу. Я перакананы, што беларускіх змагароў трэба падтрымліваць уласнымі сродкамі. І толькі наша агульная салідарнасць можа зрушыць горы. Пад бел-чырвона-белым сцягам мы абавязкова пераможам!

# Скрадзенае жыццё Вітальда Глінскага

Працяг са старонкі 1.

Праз маскоўскую Лубянку восенню 1940 года Глінскі трапіў у лагер №303, на паўночны захад ад Якуцка. Спачатку працаваў на лесапавале, потым, пасля траўмы, — у кузні. Жонка начальніка лагера неяк папрасіла яго парамантаваць радыё. На сцяне начальніцкага кабінета вязень пабачыў падрабязную карту Азіі. Відаць, тады і нарадзіўся план уцёкаў, ажыццявіць які ўдалося з пачаткам вайны, калі нагляд за вязнямі аслабеў.

Ноччу, у нялюдскую завею, Вітальд мінуў лагерныя вышкі. І пабачыў, што за ім па глыбокім снезе цугам ідуць яшчэ шэсць зэкаў. Ён сказаў ім, што будзе рухацца па дваццаць гадзін у дзень, пакуль не міне мяжу СССР. Калі нехта не згодны — можа вяртацца. Да мяжы было 2,5 тысячы кіламетраў.


Нават жонка не ведала ўсіх падрабязнасцяў уцёкаў Вітальда Глінскага з ГУЛАГа.

Так яны і пайшлі, след у след. Першы прабіваў снежную цаліну, апошнія замяталі сляды хваёвымі лапкамі.

Іх група была інтэрнацыянальная: здаравенны крымінальнік Батко — ці то беларус, ці то украінец, харват Зара — былы ўладальнік кавярні, таямнічы амерыканец Сміт, які працаваў да арышту інжынерам у Маскве, некалькі польскіх жаўнераў.

Пазней яны падабралі маладую дзяўчыну — Хрысціну Палонскую, што ўцякла з калгаса, баючыся пакарання за забойства гвалтаўніка. Дарогай яна памерла ад гангрэны.

Цяжкасці шляху — гарачыню, якая змяніла холад, смагу і голад, калі даводзілася піць мачу і есці змеяў, дарогі праз пустыні і горы — вытрымалі не ўсе. Да Індыі дайшлі Глінскі, Зара, Батко і Сміт. Дзякуючы апошняму, падазроную кампанію не расстралялі брытанскія вайскоўцы ў Калькуце. Там жа скончылася іх неверагоднае падарожжа даўжынёй у 6,5 тысячы кіламетраў і працягласцю ў 11 месяцаў.

Трохі ачуняўшы ў індыйскім шпіталі, Глінскі запісаўся добраахвотнікам у польскую армію Андэрса. Праз Іран і Егіпет ён трапіў у Англію, удзельнічаў у высадцы саюзнікаў у Нармандыі, пасля вайны служыў у брытанскім акупацыйным корпусе ў Германіі. Урэшце, канчаткова перабраўся ў Вялікабрытанію. Шлях у родныя мясціны для ўцекача з ГУЛАГа быў заказаны.

Свае прыгоды Глінскі апісаў у спецыяльным рапарце, які падаў у польскае пасольства ў Лондане. Верагодна, там яго і знайшоў сярод іншых папер чыноўнік Славамір Равіч.

Вітальд Глінскі паўстагоддзя маўчаў пра тое, што Равіч стаў славутым, спісаўшы яго гісторыю. Хоць сюжэт «Доўгага падарожжа» трохі адрозніваўся ад рэальных падзей. Дый не ўсе удзельнікі ўцёкаў былі б радыя, калі б адкрылася праўда. Зямляк Батко, якога Глінскі пасля вайны спаткаў у Лондане, пагрозліва загадаў яму маўчаць — да вайны яго шукалі ў Польшчы за забойства. Відаць, жыў цяпер пад чужым імем і баяўся выкрыцця.

Праўда ўсплыла толькі ў 2006 годзе. Адкрыліся вайсковыя дакументы, паводле якіх зімой 1941 года Равіч служыў у Персіі і ніяк не мог уцячы з сібірскага лагера. Журналіст ВВС Х'ю Левінсан выявіў нестыкоўкі ў аповедзе Равіча і знайшоў сапраўднага героя тых падзей — Вітальда Глінскага. Зараз аб ім, як і аб Равічы, ствараюць фільм. Адно што дакументальны.

Вось такая гісторыя, у якой адзін ураджэнец Беларусі скраў жыццяпіс у іншага, а Галівуд зняў паводле яго фільм аб прыгодах паляка ў Сібіры.

**Алесь Пілецкі паводле Newsweek, mirror.co.uk**


**Батко ў галівудскім фільмеператварыўся ў расійскага крымінальніка. Яго грае Колін Фарэл.**

# Пісьменнік, які не меў супернікаў

На 91-м годзе жыцця памёр Джэром Сэлінджэр.

Геній-мізантроп, зачараваны самотнік, аўтар геніяльнага рамана «Лавец у жыце» — такім ён застанецца ў памяці. З усёй пазнейшай сваёй спадчыны Сэлінджэр дазволіў публікаваць толькі адно апавяданне — «Акіян, поўны шароў боўлінга». І то — праз 50 гадоў пасля смерці. Хоць, калі верыць дачцэ пісьменніка, у бацькавым сейфе ляжаць рукапісы двух новых раманаў. Як галоўны герой «Лаўца ў жыце» Голдэн Колфілд, яго стваральнік любіў пускаць едкі цыгарэтны дым у твар грамадству.

У Злучаных Штатах, што засталіся наўзбоч еўрапейскіх катаклізмаў XX стагоддзя, бунт кожнага новага пакалення меў свайго ідэолага-пісьменніка. «Гронкі гневу» — «Лавец у жыце» — «Зязюльчына гняздо» — «Байцоўскі клуб». Стэйнбек—Сэлінджэр—Кізі—Паланік.

Ужо ў першых няспелых апавяданнях Сэлінджэра ёсць тое, за што яго любілі: дакладна-пякучае апісанне свету падлеткаў. Сэлінджэр верыў у маральнае вяршэнства малады над няшчырай сталасцю. І, вядома, дыялогі: бліскучыя, вострыя і пра самае галоўнае.

У 1941 годзе Сэлінджэр прадаў часопісу «Нью-Ёркер» першае апавяданне, якое стане пасля сэрцам рамана «Лавец у жыце». Але часопіс не спяшаўся яго друкаваць: аўтар паказваў простую сувязь між духоўных развіццём падлетка і прагульваннем школы... У супрацьлеглай палове зямной кулі варочалася Другая сусветная. Сэлінджэр ідзе ў войска, удзельнічае ў высадцы амерыканскага дэсанта ў Нармандыі. Страляць даваўся нямнога. Ён працуе з ваеннапалоннымі, вязнямі канцлагераў, дапытвае нацыстаў. Вайна выпетрыла яго душу, «змардаванасць боем» прывяла ў вайсковы шпіталь са зрывам псіхікі.

Так і Сімур Глас, герой апублікаванага ў 1948 годзе апавядання «Добра ловіцца рыбка-бананка», не можа забыць жахі ваеннага мінулага і ўрэшце забівае сябе. Гэты твор прынёс Сэлінджэру першую вядомасць.

А ў 1951-м пабачыў свет «Лавец у жыце». Раман спадабаўся падлеткам і крытыцы. Затое яго ненавідзелі настаўнікі і істэблішмент. Большасць беларусаў прачыталі яго ў расійскім перакладзе «Над пропастью во ржи». Хоць сёння едкія словы 17-гадовага Голдэна Колфілда пра фальшывасць свету дарослых уражваюць чытача ўжо не так, як у 1951-м.

Раман здабыў сусветную славу, а яго аўтар адмовіўся ад публічнасці. Ад 1965 г. ён перастаў друкавацца і наклаў забарону на перавыданне ранейшых твораў.

Сэлінджэр жыў у гарадку Корніш, адгарадзіўшыся ад свету сцяной. Ён займаўся медытацыяй і пісаў лісты на мяжы прыстойнасці маладым прыхільніцам свайго таленту.

Яго імя зноў прагрымела, калі ў 1981 годзе забойца Джона Ленана, Марк Чэпмэн, назваў «Лаўца ў жыце» сваёй крыніцай натхнення. І, чакаючы паліцыю, дэманстратыўна яго чытаў.

Імідж Сэлінджэра — высакароднага самотніка, ахутанага таямніцай, — разышоўся па швах пры канцы 1980-х. Журналіст Іен Гамільтан надрукаваў яго біяграфію, поўную «смажаных» фактаў. Пісьменнік праз суд спрабаваў дабіцца забароны на друк. Пасля пабачылі свет успаміны маладой каханкі Сэлінджэра. Потым — мемуары яго дачкі Маргарэт... З усіх гэтых кніг паўстае вобраз скандальнай, канфліктнай перш за ўсё з сабою, натуры, чалавека, адчужанага нават ад родных.

Але любоў трох пакаленняў чытачоў суправаджае яго творы. Найвялікшай трагедыяй Сэлінджэра падаецца тое, што пасля «Лаўца» ў яго не засталося вяршыняў, на якія ўзыходзіць. Бо ўсе пераканаўчыя словы для маладых ускудлачаных нязгоднікаў ён уклаў у тую кнігу.

**ПК**


**Джэром Дэйвід Сэлінджэр**

нар. 1 студзеня 1919 у Нью-Ёрку, на Манхэтане. Яго бацька — габрэй з Польшчы Саламон Сэлінджэр — быў заможным гандляром вэнджанінай ды сырамі. Маці ірландска-шатландскага паходжання. Вучыўся ў Калумбійскім універсітэце, але не скончыў, што прывяло да разрыву з бацькам. Пайшоў у войска, удзельнічаў у высадцы ў Нармандыі 6 чэрвеня 1944. Першае апавяданне «Маладыя людзі» апублікаваў у 1940. Вядомым яго зрабіла апавяданне «Добра ловіцца рыбка-бананка» (A Perfect Day for Bananafish, 1948), славутым — раман «Лавец у жыце» (1951). Ад 1965 перастаў друкавацца і наклаў забарону на перавыданне сваіх твораў. Апошнія гады жыў у гарадку Корніш (штат Нью-Гемпшыр).




**А нехта ж усё гэта выпіў... Дом, збудаваны з бутэлек, стаіць у дачным пасёлку Пціч пад Мінскам.**

## Хто б растлумачыў Лукашэнку

26 студзеня падаўся ў Нацыянальную бібліятэку, каб папрацаваць з даведачнымі выданнямі. На подступах — хлопцы ў чорным.

Галоўны ўваход у бібліятэку зачынены. За трэцімі дзвярыма «рама» і два столікі абапал. Шмон. Паказвай, што ў сумцы, даставай усё металёвае, што ў кішэнях.

У вестыбюлі поўна вайскоўцаў (рота ганаровай варты) і група маладых турменаў. Ніводнай дзяўчыны, адны хлопцы! Збіліся, не раўнуючы, як ягняты, у купку. Усе ў аднолькавых касцюмах, у аднолькавых цюбецейках, са сцяжкамі ў руках. Будуць вітаць свайго башы. І нашага «бацьку». Іхняя экіпіроўка змусіла мяне згадаць Паўночную Карэю: і там на здымках розных урачыстых пасяджэнняў на людзях аднолькавыя касцюмы.

Пад пільным кантролем прабіраюся ў залу даведачнай літаратуры. Пачынаю працаваць. Праз колькі хвілін заходзіць «лоб» і паведамляе, што нікому да асобага распараджэння нельга выходзіць з залы. Нават па натуральнай патрэбе, як я зразумеў.

Праседзеўшы гадзіны дзве, вырваўся ў буфет. Не паспеў дапіць гарбату, як у буфет уваходзіць іншы «лоб» і кажа: або выходзьце зараз, або сядзіце і стойце ў чарзе, пакуль вам не дазволяць выйсці. Чарга знікае. Дажоўваючы бутэрброд, спрабую вярнуцца ў залу даведачнай літаратуры. Ажно не! Можна ісці толькі ў адваротны бок.

...Хто б гэта растлумачыў Лукашэнку на пальцах, што Абама не возіць сваіх гасцей у бібліятэку Кангрэса, а Мядзведзеў — у Румянцаўскі музей. Што для прыёму ўсякіх начальнікаў і правадыроў мацца рэзідэнцыі ў Вайсковым завулку, у Заслаўі (там Брэжнеў прымаў Пампіду), у Віскулях нарэшце?

Мо міністр Павел Латушка асмеліцца сказаць свайму шэфу, што ў бібліятэкі іншае функцыянальнае прызначэнне?

**Анатоль Сідарэвіч, Мінск**

## Сістэма «БелКарт» дагэтуль не выпусціла ніводнай карткі на беларускай мове

Пайшоў атрымліваць новую зарплатную картку «Maestro» ад Беларусбанка (Мяснікова, 40). Дадаткам да карткі цяпер у абавязковым парадку выдаецца пластыкавая карта нацыянальнай плацёжнай сістэмы «БелКарт».

Пабачыў, што на картцы «БелКарт» мае імя і прозвішча пазначаны кірыліцай на расійскай мове. На пытанне, ці можна напісаць заяву, каб перарабілі на беларускай мове, адказалі, што гэта немагчыма.

Пасля, у размове з загадчыцай аддзела, высветлілася, што прадпрыемства, якое выпраўляе для Беларусбанка карткі (выціскае імя на пластыку) не мае тэхнічных магчымасцяў выціскаць імя па-беларуску. З гэтай прычыны напісаў заяву на скасаванне карткі «БелКарт», і яе адразу пры мне і знішчылі.

Каб неяк паўплываць на гэтую абсурдную сітуацыю, прыйшлося пакінуць запіс у кнізе заўваг і прапаноў наступнага зместу: «Сёння мне было адмоўлена ў выдачы карткі сістэмы «БелКарт» з прозвішчам і імем на беларускай мове. Гэта прыкра, бо сістэма «БелКарт» пазіцыянуецца як нацыянальная. Прашу вырабіць і выдаць мне пластыкавую картку «БелКарт» з прозвішчам на беларускай мове (кірыліцай ці лацінкай)».

Мо нешта з гэтага і выйдзе?

**Мікалай З., Мінск**

## Тэлевізійныя ліфты

Даўно не быў на сваёй колісь роднай тэлевізіі. Але ў сваё юбілейныя дні мусіў зазірнуць. І што ж я ўбачыў?

Шмат моладзі, шмат новых людзей, сярод іх зрэдку трапляліся і даўнія знаёмыя: ранейшыя дыктары, загадчыкі рэдакцыі, аддзелаў. Але не яны, як я зразумеў, на тэлевізійны клімат уплываюць. Сучасная тэлевізія ў руках іншых людзей. Менавіта яны разам з дзяржаўным ідэолагам акрэслілі аблічча сучаснай тэлевізіі. А гэтае аблічча, як вядома, зусім не беларускае: ні зместам, ні формаю. І найперш, з блакітнага экрана выгнана наша родная мова, а з ёю, лагічна, і наш менталітэт. Нечуваная ў гісторыі народаў практыка! Як яе кваліфікаваць? Згаданая практыка — гэта праява чаго? Нігілізму? Русіфікацыі? Фашызму?

Як бы яе ні кваліфікавалі, а адно зразумела: злачынства перад беларускім народам.

На сваё апраўданне ініцыятары выгнання нашай мовы з блакітнага экрана могуць сказаць: а народ маўчыць, народ згодны з намі. Народ не пратэстуе.

Але ці маўчыць? Ды не пра гэта я хацеў. Пра гэта і так усім відавочна. Уразілі мяне на сучаснай тэлевізіі тэлевізійныя ліфты. Адзіна яны гамоняць на нашай мове. Камфартабельныя, яны прыглушана, з густам абвяшчаюць: «Першы паверх, другі, трэці...»

Мо толькі тут, у ліфце штодня, штохвілінна і пачуеш нашу мову. Што можна сказаць з гэтай нагоды? Тэлевізійнікі — вялікія вынаходнікі. Цікава, а хто ж аўтар гэтага вынаходніцтва? Каму вы павінны быць удзячныя? Але як бы яно там ні было, калі вы хочаце пачуць беларускі дух на сучасным Беларускім тэлебачанні, прасіцеся ў тэлевізійны ліфт.

**Уладзімір Содаль, Мінск**



## Сцяг для ціхіх Міронаў

**Мая прапанова ціхім Міронам, што адвакатуюць еўрапейскі выбар Беларусі: карыстацца сцягам Каба-Вердэ.** А што? Ніхто не папракне, што сімволіка незарэгістраваная! І яшчэ адна жалезная адмазка (калі міліцыянты прычэпяцца): маўляў, я — за дынамічнае развіццё двухбаковых адносін Беларусі і Каба-Вердэ!

**Уладзіслаў Доўнар-Залескі, Мінск**

## Не чапайце Амерыку

У нас многія, падпадаючы пад уплыў расійскай прапаганды і «гумарыстаў» кшталту Задорнава, лаюць Амерыку.

Маўляў, амерыканцы хочуць камандаваць усім светам, а дома парадку зрабіць не могуць. Але ніякі Лукашэнка ці Чавес не далі б рады і тыдзень пакіраваць Злучанымі Штатамі. Бо іх метады, заснаваныя на здушэнні ўсяго, што не падабаецца, у ЗША не працуюць.

Насельніцтва Штатаў складаецца з прадстаўнікоў усіх народаў Зямлі, аб'яднаных правам адстойваць свае нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы. Гэта такая грымучая сумесь, што застаецца толькі захапляцца розумам стваральнікаў Канстытуцыі ЗША, якія здолелі даць настолькі ўніверсальныя законы. І сілай духу іх паслядоўнікаў, якія тых законаў трымаюцца. Бо ЗША застаецца флагманам сусветнай эканомікі і прыкладам дэмакратыі, хто б што ні плёў.

**Зміцер Голуб, Валожын**

## У Беларусі мужчынскі твар

Паводле апытання, праведзенага студэнтамі-актывістамі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, краіна мае твар Францыска Скарыны.

Студэнты-актывісты вырашылі ўзяць прыклад з украінскіх і расійскіх арганізатараў конкурсу «Імя краіны» і правесці апытанне ў студэнцкім асяроддзі на тэму: «Каго можна лічыць тварам Беларусі?». Свае меркаванні выказалі каля тысячы чалавек. Арганізатарамі праекта быў створаны спіс з імёнаў 50 найбольш вядомых людзей Беларусі розных часоў і накірункаў дзейнасці.

Побач сталі Еўфрасіння Полацкая і Сімяон Полацкі, Тадэвуш Касцюшка і Аляксандр Мяснікоў, Максім Багдановіч і Аляксандр Глеб, а таксама Кастусь Каліноўскі, Міхал Вітушка, Зянон Пазняк... спіс пачэсна завяршыла імя кіраўніка краіны. Моладзь павінна была выбраць самага годнага беларуса.

Дзясятка лідэраў выглядае так:

Францыск Скарына (15%);

Еўфрасіння Полацкая (12%);

Васіль Быкаў (10%).

Далей ідуць Вітаўт Вялікі (7%) і Кастусь Каліноўскі(6%). Аляксандр Лукашэнка адстаў ад начальніка паўстання 1863 г. на 1%, пакінуўшы за сабой Якуба Коласа (5%) і Янку Купалу (4%). Усяго 2% галасоў атрымаў Усяслаў Чарадзей, а 1% — ... Аляксандр Глеб (!).

З вышэйназванага спісу вынікае, што ў Беларусі мужчынскі твар першадрукара. Аднак астатнія вынікі апытання наводзяць на думкі не вельмі станоўчага кшталту.

Ніводнага голасу не атрымалі Уладзіслаў Сыракомля і Станіслаў Шушкевіч.

Зянона Пазняка пазначылі тры чалавекі.

Ларыса Геніюш набрала менш, чым Аляксандр Мяснікоў, а Пятро Машэраў пераплюнуў па колькасці набраных галасоў усіх дзеячаў БНР разам узятых.

Пра многіх дзеячаў удзельнікі апытання проста не чулі. Можа быць, у сваім веданні гісторыі студэнты вышэйшых навучальных устаноў ідуць далей курса «Мая Радзіма — Беларусь»? А сучасныя героі тыя, чые імёны можна кожны дзень пачуць па тэлебачанні або прачытаць у газеце?

**Ганна Журавіна**

## УДАКЛАДНЕННЕ

Залацістая калядная паштоўка, надрукаваная ў «НН» №1'2010 на старонцы 16, была падпісана як выраб кампаніі «Будзьма». А яе зрабіла не кампанія, а Сяргей Бахун. За што яму пашана і гонар.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Беларускі Чырвоны Крыж збірае цёплую вопратку

У сувязі з моцнымі маразамі Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа звяртаецца да насельніцтва з просьбай дапамагчы ў зборы зімовай вопраткі і абутку, а таксама коўдраў (чыстых, у добрым стане).

Помач атрымліваюць сацыяльна неабароненыя групы насельніцтва: адзінокія пенсіянеры, інваліды, дзецісіроты, пацыенты дамоўінтэрнатаў, бежанцы, бяздомныя. Толькі за студзень 2010 дапамогу Чырвонага Крыжа атрымалі тысяча семсот трыццаць дзевяць чалавек, з іх дзвесце дзесяць — людзі без пэўнага месца жыхарства.

Кантакты: (029) 620-78-79; rusakov.dmitry@gmail.com (Дзмітрый Русакоў), 227-66-82; (029) 116-30-21 (Ірына Каранчук).

# Аліса ў краіне жахаў

Чарговы фільм Бёртана, апошняя роля Лэджэра, новыя Робін Гуд і Аліса, Шрэк–4... Кінапрэм'еры 2010–га.



### Фантазіум доктара Парнаса

Паспяхова паказаная ў пазаконкурснай праграме Канскага фестывалю стужка Тэры Гільяма «Фантазіум доктара Парнаса» ўжо дэманструецца ў Мінску. У ёй распавядаецца пра ўгоду ілюзіяніста з д'яблам і падарожжы ў паралельныя сусветы. Тут — акторскае сузор'е: ад Джоні Дэпа і Крыстофера Пламера да сіпатага выканаўцы блюзаў Тома Уэйтса. І яшчэ — гэта апошняя роля Хіта Лэджэра («10 рэчаў, якія я ненавіджу ў табе», «Гісторыя рыцара»). У «Фантазіуме» Лэджэр сыграў шыбеніка.

### Аліса ў краіне цудаў

Неаказчнік Цім Бёртан («Эдвард Рукі-нажніцы», «Чарлі і яго шакаладная фабрыка», «Бэтман») звычайна робіць дзіцячыя фільмы. Але гэтым разам усё будзе па-даросламу. Амаль. Усе героі Кэрала (Чырвовая Каралева, Белая Каралева, Соня, Чашырскі Кот) у яго фільме застануцца ў сваім узросце, але сама Аліса падрасце да дзевятнаццаці гадоў. Ды кінецца ўцякаць ад нялюбага жаніха.

Мяркуючы па кінапрадвеснікутрэйлеру, кіно з заўсёднымі містычнымі выхадкамі Бёртана здольнае будзе выклікаць калі не мароз, дык, прынамсі, мурашкі па скуры. Здымаецца там і ўсюдыісны Джоні Дэп. Чаканая прэм'ера пройдзе ў сакавіку.

### Робін Гуд

Рэжысёр Рыдлі Скот зноў прымусіў свайго ўлюбёнага гладыятара Расэла Кроу змагацца за справядлівасць. Толькі перакінуў з Рыма ў Шэрвудскі лес і атачыў ворагамі з асяроддзя сярэднявечнага англійскага істэблішменту. Так-так, слаўны хлопец «Робін Гуд» вяртаецца, а поруч з ім рудая прыгажуня Кейт Бланшэт. Колькі мы іх ужо бачылі, тых Робінаў Гудаў...

### Як прыручыць цмока

«Як прыручыць цмока». Гэты мульцік зрабілі, відаць, у процівагу ўсім хорарам 2010-га. Гэтая пацешная анімацыя пра Хікупа Харэндуса Хэдака III, спадкаемца трона каралеўства вікінгаў. Малады чалавек мае адну маленечкую праблемку: ён, у адрозненне ад сваіх продкаў, не герой. Нават выпраўіўшыся забіць самага-самага жахлівага цмока, Х.Х.Х.-ІІІ знаходзіць замест пачвары бяззубую рэптылію. Што рабіць: вікінг знаёміцца з цмокам, і разам яны рушаць на пошукі сапраўдных прыгодаў. Мы ў адказе за тых, каго збіраемся забіць.

### Шрэк-4

«Шрэк», які выйшаў на кінастудыі «Дрымворкс», спаборніку «Дыснэя», пакрысе ператвараецца ў серыял. У маі будзе чацвёртая частка. У ёй мы пабачым ужо сямейнага, з дзеткамі, Шрэка, які нібы і прызвычаіўся да ціхамірнасці хатняга жыцця, але сумуе па прыгодах мінулых гадоў-серыяў. Аж пакуль злы карлік не перакідае яго, як Морфеус — Неа, у іншую рэальнасць. Там няма ні дзетак, ні жонкі, балбатлівы сябра-асёл робіцца ўзважаным інтэлектуалам, кот у ботах мяняе шаблю на ружовы лук, а ён і Фіёна, яго любая Фіёна, незнаёмыя...

### Масакра

У 2010-м мае выйсці і айчынная жахалка «Масакра» ад рэжысёра фільма «Акупацыя. Містэрыі» Андрэя Кудзіненкі.

Кудзіненка прыдумаў стылю свайго новага кіно назву bulba-horror. Ён кажа, што зважаў на традыцыі фантастычных, пераплеценых з фальклорам твораў Яна Баршчэўскага і Уладзіміра Караткевіча. Але «бульба-хорар» —гэта не традыцыйны фільм жахаў, «бульба хорар» — гэта калі і страшна, і смешна.

Дзея карціны адбываецца на фоне паўстання 1863 г. у маёнтку графа Пазуркевіча. Там гасцюе малады самазванец, які называе сябе прафесарам і заляцаецца да графавай нявесты. Аднак дзіўныя падзеі, што адбываюцца ў маёнтку, уцягваюць госця ў вір містычнай і жудаснай гісторыі. Фільм плануюць здаць 2 ліпеня.

**Ліза Кавальчык**

## СЦІСЛА

### Rammstein: колькі гэта будзе каштаваць?

10 тысяч квіткоў на канцэрт нямецкага гурту Rammstein паступілі ў продаж з 21 студзеня. Канцэрт адбудзецца 7 сакавіка. Білеты каштуюць ад 80 да 300 тысячаў, але ў касах Палаца Рэспублікі самых народных квіткоў на танцпол за 135 тысячаў ужо не засталося. Разышліся і самыя дарагія квіткі, 300-тысячныя, на стаячыя месца ў фэн-зоне ля сцэны.

Для жыхароў іншых гарадоў самы хуткі спосаб купіць іх праз праз сайт ticketpro.by.

Што будзе на мінскім канцэрце Rammstein'у? На разагрэве гледачы ўбачаць нарвежска-амерыканскую індастрыялкаманду Combichrist, якая суправаджае Rammstein падчас усяго сусветнага турнэ. У асноўнай часты пачуюць песні: з новага альбома Liebe Ist Fur Alle Da/«Каханьне існуе для ўсіх», а таксама старыя хіты.

Гэта першы канцэрт такога ўзроўню на ўрачыста адкрытай 30 студзеня «Мінск-Арэне» (пр.Пераможцаў, 111).

### Беларускі адказ бітлам




У Мінску прайшла прэс-прэзентацыя музычнага праекта «Такога няма нідзе» **(на фота)**. Песні, стылізаваныя пад 1960-я, напісаў Лявон Вольскі, а выканалі іх айчынныя музыкі і акцёры. У красавіку мае адбыцца канцэрт для шырокай публікі. Будуць праспяваныя не толькі песні з дыска, але і сусветныя хіты ў выкананні беларускіх музыкаў.

### Выданне беларускамоўных кніг — справа прыватных выдавецтваў

Паводле Мініфармацыі, у 2009 г. выйшла 12885 кніжных найменняў агульным накладам 22,8 млн асобнікаў. Гэта меней, чым у 2008, бо выдавецтва «Харвест» (прадстаўнік расійскага «АСТ») скараціла аб'ёмы ў чатыры разы праз крызіс. Беларускамоўныя кнігі ў 2009 г. склалі 1884 пазіцыі з накладам 5,26 млн. Большасць выйшла ў прыватных выдавецтвах. У лідэрах застаюцца вучэбная і вучэбна-метадычная (39%) і мастацкая (35%) літаратура. Дзяржава выдаткавала ў 2009 г. падкантрольным выдавецтвам 3 млрд рублёў на вучэбную і 2,5 млрд — на сацыяльна значную літаратуру.

### У Рагачове будзе вуліца Караткевіча

У гонар класіка пераназавуць вуліцу Чкалава. Рагачоў займаў асаблівае месца ў творчасці Караткевіча. Карані пісьменніка-рамантыка з боку маці наўпрост звязаныя з гэтым горадам. Пісьменнік часта прыязджаў сюды да сваякоў. Тут напісаныя раманы «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Каласы пад сярпом тваім», аповесць «Чазенія».

**Кастусь Матушыч, Павал Касцюкевіч, БЕЛТА**

## Фільм 1939 года пераплюнуў «Аватар»

*Журналісты каранавалі «Аватар» як самую прыбытковую кінастужку ўсіх часоў.*

Новы фантастычны фільм Джэймса Кэмерана прынёс $1,859 млрд па ўсім свеце, абагнаўшы Кэмеранаўскую ж меладраму «Тытанік» (якая зарабіла $1,843 млрд).

Але ў гэтых дадзеных не ўлічваецца інфляцыя даляра. Калі яе ўзяць пад увагу, дык самым прыбытковым застаецца... зняты ў 1939 годзе фільм «Знесеныя ветрам». «Аватар», паводле такой сістэмы падліку, знясе ажно на 26-е месца.

«Аватар» — гэта фільм пра паўстанне жыхароў планеты Пандора супраць землянаў-акупантаў. Ён ідзе шэсць тыдняў і мае вялікую папулярнасць па ўсім свеце. Напрыклад, у мінскім кінатэатры «Кіеў», дзе фільм паказваюць у 3D-фармаце, раскупленыя квіткі да канца лютага. А кітайцы нават пераназвалі ў гонар «Аватара» гару, якая натхніла рэжысёра на стварэнне краявідаў планеты Пандора.

**ЛК**

# Пасол Польшчы Генрык Літвін: Святкаванне 600-годдзя Грунвальда будзе чатырохбаковым

Пасол Польшчы ў Беларусі Генрык Літвін хоць і дыпламат, але па першай сваёй спецыяльнасці гісторык. Таму, хоць журналіст «НН» скіраваўся да пасла, каб пагаварыць аб маючым адбыцца 600-годдзі Грунвальда, размова пайшла і пра іншыя паваротныя моманты гісторыі Польшчы і Беларусі.

**«Наша Ніва»: Сёлета спаўняецца 600 гадоў з дня Грунвальдскай бітвы. Як плануецца адзначыць гэты вялікі юбілей? Ці плануе польскі бок запрасіць да ўдзелу ў святкаванні афіцыйных асоб з Беларусі?**

**Генрык Літвін:** Так, натуральна. У Польшчы запланавана шмат урачыстасцяў, звязаных са святкаваннем гэтай даты. Сярод іх і арганізаваныя польскім урадам. За апошнія адказвае Міністэрства культуры. Яно навязала кантакты з міністэрствамі зацікаўленых краін і падрыхтавала супольныя мерапрыемствы.

Супольныя ўрачыстасці адбудуцца ў дзень Грунвальдскай бітвы альбо вельмі блізка па часе ад гэтай даты. Праўдападобна, адбудзецца рэканструкцыя бітвы ў палявых умовах. Запланаваны ўдзел афіцыйных прадстаўнікоў чатырох краін: Літвы, Польшчы, Беларусі і Украіны. Аб гэтым размаўлялі міністры культуры — Б.Здраеўскі і П.Латушка. Плануецца, што мерапрыемства наведаюць чатыры міністры культуры названых краін. Запланаваная і вялікая канферэнцыя ў Кракаве з удзелам беларускіх гісторыкаў. Польскі бок таксама разлічвае на ўдзел ва ўсіх імпрэзах, падрыхтаваных беларусамі, літоўцаў і украінцаў. Падрабязнасці ўдакладняюцца, аднак сама формула чатырохбаковага святкавання прынятая на ўсіх узроўнях.

**«НН»: Для беларусаў і палякаў сярэднявечная гісторыя шмат у чым супольная. Ці здольныя падзеі тых часоў паўплываць на нашыя адносіны сёння?**

**ГЛ:** Гэта не справа будучыні. Гэта ўжо адбываецца. Вяртанне да гісторыі, супольнай для абедзвюх нацый, становіцца прычынай, па якой сёння мы становімся ўсё больш блізкімі. І ўсё лепш разумеем адзін аднаго. Нам прасцей даходзіць да праўды, калі робім гэта супольна. Вядома, часам паўстаюць рознагалоссі. Бо палякі, беларусы, украінцы, звяртаючыся да падзей эпохі сярэднявечча, ужываюць нацыянальны пункт гледжання. Апісваюць тыя падзеі сучаснымі катэгорыямі.

Гісторыя Рэчы Паспалітай — гэта гісторыя адразу некалькіх народаў. Гэта важная з'ява з пункту гледжання еўрапейскай гісторыі ўвогуле. Існуе схільнасць разглядаць наш рэгіён як перыферыю. Але калі зірнем на яго з сучаснай перспектывы — перспектывы адносінаў паміж дзяржавай і грамадствам, — то выявіцца, што наш рэгіён быў у авангардзе той справы. Варта голасна разам аб гэтым гаварыць.

**«НН»: Як успрымаюць ВКЛ у сучаснай Польшчы? Ці звязваюць сучасных беларусаў з той традыцыяй?**

**ГЛ:** Існуе меркаванне, што ВКЛ з'яўляецца супольным не толькі для беларусаў і літоўцаў, але і для палякаў. Трэба памятаць, колькі польскіх палітычных і культурных дзеячаў паходзіла адтуль.

Так склалася, што частка эліты ВКЛ стала палякамі. Не ўсе сталі беларусамі і літоўцамі. Таму гэта і наша традыцыя. Так склаўся гістарычны лёс. Тут няма нічога дрэннага. І менавіта таму ў Польшчы гатовыя зразумець шматэтнічнасць тэрыторый, на якіх існавала Вялікае Княства.

**«НН»: Ці існуе ў сучаснай Польшчы ідэя палітычнага адраджэння Рэчы Паспалітай?**

**ГЛ:** У Польшчы такой палітычнай ідэі няма. Зараз ніхто ў Польшчы падобных палітычных праектаў і ідэй не прапагандуе. Не сутыкаўся з тым.

Грамадзянскія і культурныя ініцыятывы, што сыходзяць з Польшчы, часам памылкова ўспрымаюцца звонку як палітычныя. Усе такія праекты датычаць выключна гісторыі і супольнай традыцыі, але не палітыкі. Яны скіраваныя на збліжэнне суседніх народаў. На збліжэнне ў якасці самастойных суб'ектаў. Мы суседзі і павінны быць блізкія адзін аднаму не толькі геаграфічна.

З Літвой тое працей, бо існуе ЕС. Гэта шмат дае і ліквідуе фармальныя межы.

**«НН»: Міжваенны перыяд у Беларусі і Польшчы трактуецца па-рознаму. Ці існуе магчымасць знайсці паразуменне па гэтым пытанні?**

**ГЛ:** Гэта як грэчаская трагедыя. Народы пасля некалькіх стагоддзяў зняволення былі вымушаныя скарыстацца з аднаго моманту, каб атрымаць незалежнасць. Гэтыя народы знаходзіліся на розных этапах гістарычнага развіцця. На той момант палякі, у сілу розных прычын, апярэджвалі сваіх суседзяў. Нацыянальная свядомасць была значна мацнейшай.

Гэта стала асноўнай прычынай таго, што палякі пераянялі традыцыі Рэчы Паспалітай. Беларусы, украінцы і літоўцы сталі ў апазіцыю да РП. Гэта было натуральным жаданнем народаў выйсці з канфліктнай сітуацыі. І адначасова прыносіла шкоду для нацыянальнага развіцця. Усе народы даўняй РП мелі права на яе спадчыну. Тут, акурат, беларусы адрозніваюцца ад літоўцаў і ўкраінцаў. Яны канфліктавалі з ідэяй Рэчы Паспалітай найменш. Спрэчка паміж беларусамі і палякамі прынесла найменш крыві.

Разам з тым, знайсці на той момант канцэпцыю, якая б задавальняла ўсіх, было немагчыма.

Я ўдзельнічаў у супольных беларуска-польскіх сустрэчах гісторыкаў. Насамрэч вялікай розніцы паміж намі няма. Розніца з'яўляецца на ўзроўні палітычнага трактавання гістарычных даследаванняў. Палітыкі ўжываюць гісторыю так, як ім тое патрэбна. Гісторыкі на тое не могуць паўплываць. Польскія даследуюць імкненне палякаў да свабоды, беларускія — тыя ж імкненні беларусаў. Але гэта не канфлікт. Гэта натуральная сфера зацікаўленняў, паміж якімі няма спрэчнасці.

Для Польшчы 1939 год — трагедыя. Іначай не можа быць. Былі памылкі і недахопы ў міжваеннай Польшчы, але гэта была дзяржава, якая прызнавала ідэю служэння свайму грамадству. На жаль, яна была знішчаная суседзямі, якія прапаведвалі ўсемагутнасць дзяржавы.

Таму гэта была трагедыя не толькі для Польшчы, але і для ўсёй Еўропы. Агрэсары хацелі давесці ўсім, што з народамі, якія насялілі нашую частку Еўропы, толькі так і можна паступіць.



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Генрык Літвін**

польскі гісторык і дыпламат. Пасол Польшчы ў Беларусі. У 1982 скончыў навучанне ў гістарычным інстытуце Варшаўскага ўніверсітэта. У 1988 абараніў дысертацыю «Наплыў польскай шляхты ва Украіну ў 1569—1648». Да 1991 працаваў ад'юнктам у Польскай Акадэміі навук. З 1991 працаваў у Міністэрстве замежных спраў. Быў консулам у Львове, намеснікам кіраўніка Дэпартамента МЗС Еўропа —Усход, які адказваў за адносіны Польшчы з Беларуссю і Малдовай. У 2002—2003 — намеснік пасла Польшчы ў Расіі. Ад лютага 2006 — пасол Польшчы ў Беларусі.

Ні ў якім разе мы не можам, аднак, забыць тых часоў. Нельга забыць у тым ліку ахвяр катынскага спісу, у якім знаходзяцца не толькі палякі, а і прадстаўнікі іншых народаў РП. Пакуль справа не будзе раскрытая да канца, яна будзе актуальнай.

Эмоцыі палякаў, звязаныя з 1939 годам, маюць гістарычнае вымярэнне і выкліканы ў значнай ступені ахвярамі, панесенымі ў той перыяд. Яны не пераносяцца на пытанні геапалітыкі. Палякі прызнаюць сённяшнія межы дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і лічаць іх фундаментам спакою і дабрабыту для Польшчы і ўсёй Еўропы. Мы прызнаём іх як справядлівыя.

У Беларусі 1939 год часта называецца годам аб'яднання. Я думаю, што гэтага больш заслугоўваюць 1944—1945. Бо сучасныя межы Беларусі не адпавядаюць межам 1939 года і, называючы яго аб'яднаўчым, можна выклікаць рэвізіяністычныя ідэі. Ці нам гэта патрэбна?

**«НН»: Як бачаць беларусаў палякі зараз, праз дваццаць гадоў незалежнасці?**

**ГЛ:** Стаўленне да беларусаў у Польшчы добразычлівае. Але больш інстынктыўнае, чым абгрунтаванае нейкімі ведамі. Гэтых ведаў бракуе. Беларусаў часта ўспрымаюць праз прызму розніцы ў палітычнай сістэме, і гэта натуральна. Розніца існуе і не можа не ўплываць на ўспрыманне.

**«НН»: А як беларусы палякаў успрымаюць? Якія Вашыя ўражанні?**

**ГЛ:** Неадназначна. Гэта залежыць ад канкрэтнай асобы. Але ў цэлым таксама добразычліва. Натуральна, у розных сітуацыях можна сустрэцца з розным стаўленнем, часам нават з агрэсіўным. Як і з адваротнага боку. Не бывае так, каб замежнік сустракаўся выключна з добразычлівым стаўленнем. Але ў цэлым Беларусь вельмі добразычлівая для замежнікаў краіна.



**У Грунвальдзе збяруцца прэзідэнты цэнтральнаеўрапейскіх краін**

Канцылярыя прэзідэнта Польшчы Леха Качынскага папярэдне запланавала мерапрыемствы з удзелам кіраўнікоў цэнтральнаеўрапейскіх дзяржаў на 15 ліпеня. Урачыстасці пройдуць у самім Грунвальдзе. Запланаваны таксама візіт у велічны замак ў Мальбарку. Пакуль няясна, ці будзе запрошаны ў Грунвальд Аляксандр Лукашэнка. Імаверна, рашэнне пра гэта яшчэ не прынята.

**Праграма юбілею Грунвальда**

**15 ліпеня** — прадстаўленне «Грунвальдская перамога» з прывітаннем караля Ягайлы, князя Вітаўта і рыцараў. Прамовы цэнтральнаеўрапейскіх прэзідэнтаў.

**16 ліпеня** — рыцарскі фестываль. Плануецца, што яго наведаюць 100 тыс. гледачоў.

**17 ліпеня** — кульмінацыя святкавання — інсцэніроўка бітвы. У ёй маюць браць удзел аж 5 тысяч рыцараў з Польшчы, Беларусі, Германіі, Чэхіі, Літвы, Расіі і іншых краін.

У арганізацыю ўрачыстасцяў уключыліся самыя розныя рэгіёны Польшчы. У прыватнасці, з Кракава пад Грунвальд выправяцца дзесяць падводаў з 40 тыс. прэцэляў (традыцыйных галіцкіх абаранкаў) для вояраў.

Мяркуецца, што святкаванне будзе каштаваць польскім цэнтральным і лакальным уладам больш за 100 тыс. даляраў. 85% гэтай сумы прафінансуе ЕС.

Праграма фестывалю, а таксама апошнія навіны ад арганізатараў даступныя на адрасе www.grunwald2010.warmia.mazury.pl

# Бізнэсовец з Расіі набыў пад Ваўкавыскам палац за $105 000

А мог і за 35 000 рублёў. У чарзе на продаж — сядзіба ў Падароску.

Палацава-паркавую сядзібу ў вёсцы Краскі Ваўкавыскага раёна прадалі праз аўкцыён. Расійскі бізнэсовец Вадзім Селіхаў аддаў за помнік архітэктуры XIX—XX стст. $105 000 (каля 307 млн рублёў). Сядзібу ў Красках ён пабачыў у часе вандроўкі па Беларусі і «запаў».

Новы ўласнік збіраецца жыць у палацы, рамонт пачне вясной і ў першую чаргу зоймецца паркам. Палац жа паабяцаў аднавіць звонку, а інтэр'еры аздобіць чырвоным дрэвам.

Ва ўпраўленні эканомікі Ваўкавыскага райвыканкама паведамілі, што на аўкцыён было выстаўлена некалькі лотаў. У такіх выпадках патэнцыйныя пакупнікі рэгіструюцца не на канкрэтны лот, а на аўкцыён у цэлым. Таму вызначыць, хто што зможа набыць, да завяршэння працэдуры немагчыма.

Аўкцыён адбываўся паводле метаду паніжэння цаны. Бо палац спрабавалі прадаць ад 2007 года: ні мясцовы, ні абласны бюджэты не мелі сродкаў, каб стварыць у Красках сядзібна-этнаграфічны турыстычны цэнтр.

Стартавая цана Красак была 2 млрд рублёў, але ў 2009-м сядзіба каштавала ўжо 600 млн. А пайшла з малатка за палову гэтай цаны. Да Красак прыцэньваліся прыватная фірма з Баранавічаў і некалькі бізнэсоўцаў з Расіі.

Разам з палацам Селіхаў атрымае ў арэнду на 50 гадоў ландшафтны парк. «Як замежны грамадзянін, ён можа толькі арандаваць зямлю. У бліжэйшы час з прадпрымальнікам будзе афармленая адпаведная дамова», — патлумачылі ў райвыканкаме.

Паводле ўмоваў продажу, на аднаўленне панскай сядзібы новаму гаспадару даецца два гады. Праўда, што будзе, калі бізнэсовец не справіцца, — няясна.

«Продаж комплексу ў Красках я лічу выдатнай падзеяй. Інакш ён бы развальваўся далей, — заявіў журналістам старшыня Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч. — І няважна, што ўладальнікам стаў грамадзянін з Расіі. Галоўнае, каб ён укладаў грошы ў рэстаўрацыю. Цяпер Мінкульт і грамадскасць павінны адсочваць, каб ён выконваў неабходныя ўмовы».

Мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі трымаецца іншага погляду. «Пачаць трэба было з пошуку магчымых спадкаемцаў. Калі б знайшліся — прапанаваць ім набыць палац з паркам».

Гродзенскі актор Віктар Шалкевіч, вядомы яшчэ і талентам ладзіць аўкцыёны, прыгадвае, што сядзіба ў Красках, на беразе рэчкі Зальвянкі, — унікальнае месца: «Нездарма там быў санаторый для сухотнікаў. У Красках незвычайны мікраклімат».

Поспех з Краскамі натхніў мясцовыя ўлады. У 2010 годзе яны спадзяюцца прадаць сядзібу Бохвіцаў у вёсцы Падароск. Умова для пакупніка — стварэнне ў сядзібе агратурыстычнага комплексу. За колькі Падароск пойдзе з малатка — невядома. Яго, як і Краскі да продажу, Міністэрства культуры ўключыла ў спіс трыццаці безгаспадарчых гісторыка-культурных каштоўнасцяў, прызначаных для продажу інвестарам. Кожны з гэтых аб'ектаў могуць прадаць нават за адну базавую велічыню — 35 тысяч рублёў.

**СП**



### Краскі

палацава-паркавы комплекс у вёсцы Краскі Ваўкавыскага раёна. Помнік архітэктуры XIX—XX стст. Уключае палац рэтраспектыўна-замкавага стылю (збудаваны ў 1839—1905), шэраг драўляных і цагляных пабудоў, пейзажны парк плошчай 3 га з сажалкай. Першапачаткова належалі роду Сегеняў. Да 1939 Краскамі валодаў памешчык Карп. Пазней у будынках сядзібы размяшчаліся школа, дзіцячы санаторый, ваўкавыская МПМК-143. У 1990 перададзеная Ваўкавыскаму ліцейнаму заводу. Да продажу знаходзілася на балансе аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама.

Часам назву вёскі Краскі непісьменна перакладаюць як Фарбы. Між іншым, назва гэтая паходзіць ад слова «краскі», то бок палявыя кветкі. На дзяўчынку ласкава кажуць: «Красачка ты мая!» «Зерне, кінутае ў ніву, усходзе ды красуе», г.зн. квітнее, пісаў у вершы «На 5-годдзе «Нашай Нівы» Янка Купала. Упершыню Краскі Ваўкавыскага раёна згадваюцца ў летапісе 1796 года як уладанне шляхціча Яна Сухадольскага.

**КАМЕНТАР**

### Чаму беларусы не купляюць сваіх палацаў?

Бізнэсовец з Расіі набыў палац з паркам у вёсцы Краскі Ваўкавыскага раёна, помнік архітэктуры XIX—XX стст. Ён заплаціў $105000. Стартавая цана была ў разы большая. У Красках планавалі стварыць турыстычны цэнтр. Але ні мясцовы, ні абласны бюджэты з задачай не справіліся. Наступным на аўкцыён можа трапіць маёнтак у вёсцы Падароск Ваўкавыскага раёна.

Чаму беларусы не купляюць свае палацы? Можа, з асцярожнасці — не высоўвацца, не хваліцца багаццем? Паспяховасць часта абарочваецца турэмным тэрмінам з канфіскацыяй нажытага нялёгкай працай. Сумны прыклад ваўкавыскага прадпрымальніка Міколы Аўтуховіча гэта пацвярджае. А можа, наш рэгіянальны бізнэс з пэўных прычынаў (і мы ведаем многія з гэтых прычынаў) ніяк не можа абрасці мясам, каб дазволіць сабе не такія і фантастычныя набыткі? Пытанні застаюцца, а тым часам расійскія алігархі скупляюць нашы палацы па цане не самай лепшай мінскай трохпакаёўкі.

**Сямён Печанко**

# Усё ж будзе саўна і боўлінг?

Аджыў праект па пераўтварэнні касцёла Святога Язэпа ў гатэль.

Прадпрыемства «Мінская спадчына» скончыла складаць праектна-каштарысную дакументацыю гатэльнага комплексу на месцы кляштара бернардзінцаў, паведамляюць у Таварыстве аховы помнікаў. Дакументацыя перададзеная на ўзгадненне навуковаму кіраўніку аб'екта Аляксандру Кропатаву. Гэта можа азначаць хуткі пачатак рамонтна-будаўнічых працаў.

Пра той праект перабудовы кляштара ў гатэльны комплекс з саўнай і прэзідэнцкім люксам «НН» пісала тры гады таму (№8'2007). Будынкі кляштара захаваліся ў выдатным стане. Нічога не зносілася і не перабудоўвалася, бо ў савецкія часы тут месціўся закрыты вайсковы аб'ект. Калі там зробяць гатэль, 70% гістарычнай забудовы будзе знішчана, найперш інтэр'еры кляштара, фрэскі, кажуць спецыялісты.

Паводле звестак Таварыства, з просьбай перадаць кляштар каталікам да Лукашэнкі звяртаўся мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. І той зварот быў перададзены з Адміністрацыі на разгляд у Міністэрства культуры. «Мы не спынілі намаганняў па вяртанні касцёла Св. Язэпа і кляштара бернардзінцаў, — пракаментаваў гэту інфармацыю адказны за СМІ пры Сакратарыяце Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі Аляксандр Амяльчэня. — Мы не робім гэта ў форме маніфестацый. Гэта робіцца ў форме зваротаў у розныя інстанцыі».

Вяртання святыняў у Верхнім горадзе мінскія каталікі дамагаюцца дваццаць гадоў. Аднак у маі 2005 г. тагачасны старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў пастанавіў прыстасаваць яго пад гатэльны і гандлёвы комплекс. Калі той праект трапіў у СМІ, вернікі пачалі кампанію па абароне бажніцаў. Пад сценамі касцёла Св. Язэпа ладзіліся супольныя малітвы, былі сабраныя тысячы подпісаў пад зваротам да кіраўніка дзяржавы за вяртанне святыняў. Але Міністэрства культуры ўхваліла перадпраектную прапанову па рэканструкцыі і прыстасаванні будынкаў былога кляштара бернардзінцаў пад гатэльны комплекс. Потым ініцыятары ўзялі трохгадовую паўзу. І вось зараз праект гатовы.

**СП**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



### Кляштар бернардзінцаў

заснаваны ў 1624. Фундавалі Андрэй і Ян Кансоўскія. Пасля пажару, да 1652 былі збудаваныя каменны касцёл і кляштар. Пасля рэканструкцыі 1752 будынкі набылі цяперашнія рысы. У 1864 касцёл прыстасавалі пад праваслаўную палкавую царкву Св.Кірыла і Мяфодзія (з 1872 — пад архіў), а карпусы пад казармы Каломенскага пяхотнага палка і следчую камісію. У савецкі час у касцёле размяшчаўся архіў, у кляштарным комплексе — вайсковая пракуратура.

14 лютага. 19.00.
Палац Культуры Ветэранаў



Да дня святога Валянціна! Для усіх закаханых!
ЗМІЦЕР
ВАЙЦЮШКЕВІЧ
&
WZ-Orkiestra
з праграмай «Паравіны году»
+ лепшыя песьні
+ песьні з супольных музычных праектаў
(Я нарадзіўся тут, Святы вечар, Народны альбом)

## КАНЦЭРТЫ

**Вайцюшкевіч да Дня закаханых**

Зміцер Вайцюшкевіч і WZ Orkiestra выступяць з праграмай «Паравіны года» (і найлепшыя песні) **14 лютага а 19-й у Палацы культуры ветэранаў (вул.Янкі Купалы, 21)**. Колькасць месцаў абмежаваная! **12 лютага** Зміцер Вайцюшкевіч выступіць **у Гродне ў Тэатры лялек (вул.Дзяржынскага, 1/1). Пачатак а 19-й.**

**Прыедзе «Тэлевізар»**

Аўтары перабудовачнага рок-хіта «Твой папа — фашист» — гурт «Тэлевізар» (Санкт-Пецярбург, Расія) наведае Мінск, каб справіць чвэрць стагоддзя і прэзентаваць новую праграму «Дежавю». Цяпер лідэр гурта Міхаіл Барзыкін прысвячае песню пра фашыста Пуціну з Мядзведзевым. Праз такія погляды на расійскіх тэлеканалах «Тэлевізар» не пачуеш. Канцэрт адбудзецца **6 лютага ў 19.00 ў мінскім R-Club (вул.Сурганава, 26)**.

**«Псіхея» ў «Рэактары»**

**5 лютага ў мінскім клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** зайграе гурт «Псіхея». **Пачатак у 19.00.** Квіткі: 45—55 тысяч рублёў (танцпляц), 70 000 (VIP). Даведкі: (029) 674-97-61, (029) 649-08-88, (029) 851-77-06.

**Віталь Артыст**

**14 лютага** лідэр гурта «Без білета» Віталь Артыст сыграе сольны канцэрт «Адзін кватэрнік» **у Малой зале КЗ «Мінск» (вул.Кастрычніцкая, 5). Пачатак у 19.00.** Квіткі: 30—50 тысяч. Даведкі: (029) 649-08-88.

**Трыб'ют Metallica**

**12 лютага ў «Рэактары» (вул.Харужай, 29)** пройдзе канцэрт-прысвячэнне славутаму гурту Metallica. Хіты амерыканскіх рокераў выканаюць **Aillion**, **Deadmarsh**, **Seven Seals**, **The Storm**, **Soulsides**, **Magnetica**, **TheElegy**. **Пачатак у 18.00.** Квіткі: 18 000 (першыя 100), 20 000 (наступныя 200), 25 000 (да дня канцэрта), 28 000 (у дзень канцэрта), 30 000 (месца за столікам). Даведкі: (029) 649-08-88.

## ІМПРЭЗЫ

**Магія Венецыянскага карнавала**

**13 лютага ў Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) а 19-й** пачнецца праграма «Магія Венецыянскага карнавала»: пошта амура, танцы і знаёмствы пад маскай, выбар караля і каралевы бала. Квіткі набываюцца загадзя.

**Кінабункер 2.3.**

Пасля нязначнага перапынку Кінабункер працягвае другі сезон праглядаў анармальнага кіно. Тэма трэцяга паказу: «Жаночая эмансіпацыя: лідэры і аўтсайдэры». Месца паказу: **фальварак «Добрыя мыслі» (вул.Магілёўская, 12/1). Пачатак паказу: 7 лютага а 17-й.**

**Верасень**

Чарговая прэзентацыя часопіса «Верасень» з удзелам Эдуарда Акуліна і яго каманды адбудзецца **ў Мінску 6 лютага. Пачатак а 15-й на сядзібе ТБМ (вул.Румянцава, 13).**

**Дэгустацыя марожанага з удзелам пісьменніцы Анэт Грошнер**

**13 лютага ў канферэнц-зале Інстытута Гётэ (вул. Харужай, 25/3, 4 паверх)** адбудуцца літаратурныя чытанні з удзелам нямецкай пісьменніцы Анэт Грошнер. На нямецкай мове з перакладам. У праграме — дэгустацыя марожанага. **Пачатак а 17-й.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Экстрым.by**

**У фотагалерэі Zнята (пр. Незалежнасці, 13) да 28 лютага** працуе выстава «Экстрым.by». Аўтараў аб'ядноўвае любоў да экстрэмальнага спорта і актыўнага адпачынку. На выставе сабраныя працы, зробленыя на вадзе, у гарах і небе, дзе чалавек паказаны на мяжы сваіх магчымасцяў.

**Багдановіч з пуху дзьмухаўцоў**

**У філіяле гістарычнага музея «Дом-музей I з'езда РСДРП» да 24 лютага** працуе выстава карцін з пуху Соф'і Лях. Тут можна ўбачыць партрэты беларускіх асветнікаў Ф.Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі, У.Караткевіча, У.Мулявіна, Р.Барадуліна, створаныя з пуху дзьмухаўцоў.

**Юдаль Пэн**

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** праходзіць выстава карцін Юдаля Пэна. 33 працы са збораў Віцебскага краязнаўчага музея ў Мінску экспануюцца ўпершыню. **Выстава працуе да 28 лютага.**

**Найлепшае з Цэслера і Войчанкі ў Магілёве**

**У Музеі В.Бялыніцкага-Бірулі (Магілёў) да 28 сакавіка** працуе выстава The best of V.Cesler & S.VoiCanka. У экспазіцыі прадстаўленыя творы Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі са збораў Мастацкага музея.

**Жылі-былі…**

**Ад 10 лютага да 7 сакавіка ў музеі Акадэміі мастацтваў (вул.Сурганава, 14а)** будзе працаваць выстава сучаснай дзіцячай кніжнай ілюстрацыі з Беларусі, Германіі, Ізраіля і Польшчы.

**Выстава адной карціны**

**Да 6 лютага ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** у рамках праекта «Выстава адной карціны» экспануецца палатно Івана Айвазоўскага «Ноч на востраве Родас».

**Васіль Сумараў і вучні**

**У Мастацкім музеі да 15 лютага** працуе выстава «Васіль Сумараў. Настаўнік і вучні».

**Міжнародны фестываль пейзажу**

**У галерэях «Ракурс» і «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі да 11 лютага** працуе IV Міжнародны фестываль пейзажу, прысвечаны Віталю Цвірку.

## ТЭАТРЫ

**4 лютага**

**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»

**5 лютага**

**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»

**6 лютага**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»

**7 лютага**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Дон Кіхот»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»

**8 лютага**

**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»

**9 лютага**

**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Тэатр оперы і балета** — «Макбет»

**10 лютага**

**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр оперы і балета** — «Жызэль»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Тэатр імя Янкі Купалы** (Малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»

**11 лютага**

**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»
**Тэатр імя Янкі Купалы** — «Дзеці Ванюшына»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**12 лютага**

**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»
**Тэатр юнага гледача** — «Маскарад»
**Тэатр лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»
**Тэатр оперы і балета** — «Кашчэй Бессмяротны»

**13 лютага**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і брадвей»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта»
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»

**14 лютага**

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Тэатр оперы і балета** — «Церам-церамок»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**Port Mone**

**23 лютага ў клубе «Лісіная нара» (вул.Каліноўскага, 32)** выступае гурт Port Mone. **Пачатак у 19.00.**



## АФІША

## Фантазіум доктара Парнаса

Фільм здольны як выклікаць здзіўленне, так і пакінуць абыякавым.



**Фантазіум доктара Парнаса**
(The Imaginarium of Doctor Parnassus)
Вялікабрытанія — Канада — Францыя, 2009, каляровы, 123 хв.
**Рэжысёр:** Тэры Гіліям
**Ролі выконваюць:** Хіт Лэджэр, Джоні Дэп, Джуд Лоу, Колін Фарэл
**Жанр:** Феерыя
**Адзнака:** 5,5 (з 10)

Колішні індыйскі манах доктар Парнас падпісаў дамову з чортам. Цяпер ён вандруе па Лондане і дае дзіўныя спектаклі. Кожны, хто пройдзе праз яго люстэрка, трапіць у свет сваіх мараў. Але за паслугі д'ябал патрабуе дачку доктара — Валянціну...

Пасмяротны фільм Хіта Лэджэра, які сыграў адну з галоўных роляў, махляра Тоні. Калі актор загінуў, яго ролю дапоўнілі Джоні Дэп, Джуд Лоу і Колін Фарэл.

Цуды доктара Парнаса — старамодна-наіўныя. Страшныя кардонныя дрэвы, медузы ў нябёсах, краіна пламбіраў. Дыяменты і аграмадныя пацеркі, люстэркі і канфеці. Паліцэйскія ў спадніцах і украінскія мафіёзі.

Доктар Парнас — майстар гісторый. Але ніводную гісторыю ён да канца расказаць не здольны. Ён блытаецца, п'е і ўсё забывае. Сюжэт карціны кульгае, рассыпаецца на атракцыёны з тэатральнаю машынерыяй.

Фільм здольны як выклікаць здзіўленне, так і пакінуць абыякавым.

**Андрэй Расінскі**

# Жыццё без адрыву ад манітора

Праз інтэрнэт можна і пад'есці, і падлячыцца, і нават ажаніцца.

Паводле статыстыкі, кожны трэці беларус карыстаецца інтэрнэтам. І чым больш часу людзі праводзяць за маніторамі, тым дасканалейшай робіцца сфера онлайн-паслуг. Усе чулі пра інтэрнэт-крамы з таннай тэхнікай, але якія яшчэ паслугі прапануе байнэт?

### Электронныя грошы

Цяпер праз інтэрнэт можна аплаціць камунальныя паслугі, тэлефон, крэдыт, сігналізацыю... Нават сам інтэрнэт можна аплаціць праз інтэрнэт! Як? Напрыклад, з дапамогай сістэмы Easypay. Каб ёй карыстацца, трэба зарэгістравацца на сайце easypay.by, а пасля папаўняць рахунак у паштовых аддзяленнях альбо праз банкаматы. Сфера онлайн-плацяжоў у Беларусі пакуль развітая слаба, але на Захадзе яна ўжо здабыла папулярнасць. Той, хто мае электронныя грошы, валодае светам.

### Віртуальная чарга

Прыйшоў час забывацца на чэргі ў паліклініку. Запісацца да доктара можна на сайце info.minsk.by/clinics. Усе мінскія паліклінікі працуюць з паслугай. Праўда, спіс дактароў пакуль невялікі — пяць-шэсць спецыяльнасцяў, але ўчастковыя тэрапеўты ёсць усе без выключэння.

У ЗАГСы таксама часам трэба запісвацца за паўгода да вяселля. Навошта псаваць перадшлюбны настрой у чарзе? Дастаткова зайсці ў спецыяльны раздзел на сайце Мінгарвыканкама (minsk.gov.by/ru/zags) і зарэзерваваць час. Праўда, каб падаць заяву і непасрэдна ажаніцца (выйсці замуж), адарвацца ад манітора прыйдзецца...

### Накруткі ад чыгункі

Ва ўсім свеце білеты на транспарт праз інтэрнэт прадаюцца з агромністай зніжкай. Беларускія рэаліі больш жорсткія. Каб замовіць білет на цягнік на сайце rw.by, трэба даплаціць 1300 рублёў за браніраванне кожнага месца. Яшчэ за 15 тысяч вам могуць прывезці білет дамоў.

Купіць білет на самалёт «Белавія» (belavia.by) можна з дапамогай электронных грошай альбо забраняваць і пасля прыехаць у офіс кампаніі.

«Мінсктранс» (minsktrans.by) дадатковых грошай не просіць, але і паслугу прапануе абмежаваную. Забраніраваць білет можна толькі на шэсць аўтобусных кірункаў — у Польшчу і Чэхію. Каб замовіць месца, прыйдзецца тэлефанаваць на вакзал.

### Замена тэлефону і тэлевізару

Але патэлефанаваць — не значыць выйсці з інтэрнэта. Праграма Skype, якой карыстаюцца дзясяткі мільёнаў людзей па ўсім свеце, дазваляе бясплатна тэлефанаваць іншаму карыстальніку. Каб званіць праз скайп на гарадскі ці мабільны нумар, трэба, зноў жа, мець электронныя грошы. І слухаўкі з мікрафонам. Званіць праз інтэрнэт намнога танней. Так, званок на мабільнік у ЗША будзе каштаваць 100 рублёў за хвіліну.

Інтэрнэт заменіць не толькі тэлефон, але і тэлевізар. Дзясяткі сайтаў прапануюць бясплатную трансляцыю любога канала — ад «Аль-Джазіры» і «Белсата» да «Палявання і рыбалкі». Галоўнае, каб хапала хуткасці інтэрнэта.



### У рэстаран праз інтэрнэт

Задаволіўшы інтэлектуальныя патрэбы, рана ці позна ўзгадаеш пра фізічныя. На жаль — ці на шчасце? — мыцца і чысціць зубы праз інтэрнэт немагчыма, а вось замовіць чаго-небудзь пад'есці ўжо можна.

Онлайн-піцэрыі і кавярні адчыніліся ўжо і ў абласных цэнтрах. У Мінску іх больш за дзясятак. Меню там — як у звычайных рэстаранах. Ежу прывязуць праз паўгадзіны, максімум праз гадзіну. Калі замовілі на вялікую суму, за дастаўку грошай не возьмуць.

Жыць, не адрываючыся ад манітора, робіцца ўсё прасцей. Але варта, каб не мець праблемаў са здароўем, даваць свайму целу неабходную фізічную нагрузку. І галоўнае — бачыцца з блізкімі людзьмі. Гэтага ніякія камунікатары не заменяць.

**Ягор Марціновіч**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Качкі, запечаныя з вінным соусам

2—3 качкі, 2 лыжкі масла,
1 лыжка мукі, 6—8 сардэлек,
1 шклянка віна, 0,5 лімона, соль.

Качкі падрыхтаваць, абсыпаць соллю, запячы. Падсмажыць на масле муку, развесці сокам, які выдзеліўся з качак, дадаць дробна парэзаныя сардэлькі, уліць віно, троху лімоннага соку, закіпяціць. Заліць атрыманым соусам выкладзеных на талеркі качак. Замест лімоннага соку можна выкарыстаць трохі добрага воцату.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**РОВАР**

**Ровар спартовы** 18–хуткасны, новы, блакітнага колеру, ёсць сумка, біклага, люстэрка, налепкі — «Свабода», «Еўразвяз» і г.д. Не дужа дорага (450 тыс.руб.). Т.: (17) 223–21–81, (25) 999–24–33. Слава.

**КНІГІ**

**Прадам** Біблію за 5 тыс.руб. Т.: (0212) 25–80–79.

**Набуду** кнігу: Мікуліч А.І. «Беларусы ў генетычнай прасторы: Антрапалогія этнасу». Т.: (029) 332–00–21.

**СПАЧУВАННІ**

**Шчырыя спачуванні дарагому Вінцэнту Солтану** з прычыны смерці жонкі Людмілы Антонаўны. Залаты чалавек памёр, цяжка будзе без яе. Але трымайцеся. Сябры

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

# Вышыванка для вашага Янкі

Умець вышываць і ткаць даўней мусіла і княгіня, і сялянка. Сёння паспяховая жанчына не лічыць гэта абавязковым. Чытаць-пісаць навучыліся, камп'ютар асвоілі, кар'еру спланавалі, а на захаванне даўніх умельстваў часу не стае.

Аднак вышыванкі, ручнічкі і фартушкі па-ранейшаму вабяць дзявочае вока. Можна было б на Дзень святога Валянціна любаму кашулю падарыць, ці ў госці сукенку вышываную адзець, ці на іспыт паяском тканым падперазацца, як абярэгам.



Дзе ўзяць вышыванку? Першы варыянт— зрабіць сваімі рукамі. Знайсці арнамент, які падабаецца, і вучыцца вышываць. Старанна ўкладаць усе добрыя пачуцці і энергетыку ў твор. Такую вышыванку не сорамна будзе ні самой апрануць, ні любаму падарыць, бо яна ад душы.

А калі няма часу і магчымасці? Ці так здарылася, што рукі і іголка з ніткаю сустракаліся ў жыцці так рэдка, што і пазнаёміцца не паспелі?

У Мінску вышыванку можна набыць на прадпрыемстве «Скарбніца» (вул. Кісялёва, 40). Акрамя традыцыйнага народнага ці сцэнічнага касцюма, там можна сабе замовіць сучасную вопратку з нацыянальным арнаментам ці традыцыйную вышыванку для каханага. За 100—120 тысяч вам зробяць касцюмчык вашага памеру з нескладанай вышыўкай. Аднак, чым складанейшая замова, тым даражэйшае будзе адзенне. Супрацоўнікі «Скарбніцы» ездзяць у этнаграфічныя экспедыцыі, працуюць у бібліятэках і архівах. Яны здольныя стварыць адзенне з характэрнымі матывамі пэўнай мясцовасці. Напрыклад, вашай малой радзімы.

Таксама нацыянальныя беларускія ўборы можна знайсці ў крамах «Купалінка» (пр.Незалежнасці, 19), у галерэях «Славутыя майстры» (Камунальная набярэжная, 6б) і «Славутасць» (вул. Багдановіча, 21, 2-і паверх) ці ў Рэспубліканскім культурна-асветніцкім цэнтры (вул. Кастрычніцкая, 5).

Паспрабуйце аднойчы падарыць сябрам не званочак па фэн-шую «мэйд ін чайна», а вышываначку па-беларуску. І хай яна будзе на шчасце-долю.

**Настасся Шамрэй**

## Памер таліі важнейшы за вагу

Апошнія даследаванні выявілі, што людзі з вялікай таліяй больш схільныя да інфаркту, раку, дыябету.

Медычная школа ў Гарвардзе абследавала 44 тысячы медсёстраў і прыйшла да высновы, што нават жанчыны з нармальнай вагой маюць у два разы большую рызыку памерці ад раку ці хваробаў сэрца, калі ў іх шырокая талія. Аналагічная рызыка і ў мужчынаў.

Даследаванні пацвердзілі, што рызыка для здароўя пачынае падвышацца, калі ў жанчыны талія дасягае 80 сантыметраў. Пры 89 см яна падвышаецца істотна. Для мужчынаў рызыка падвышаецца з 94 см.

Праўда, зўважае New York Times, гэта лічбы адносныя, і не падыходзяць для занадта высокіх і занадта нізкіх людзей, для дзяцей, а таксама прадстаўнікоў тых этнічных групаў, якія вылучаюцца малым ростам.

Наяўнасць тлушчу на таліі сведчыць пра наяўнасць тлушчу вакол сэрца. На памер таліі ўплывае і стрэс — у бок павелічэння.

Дактары сыходзяцца ў меркаванні, што найлепшым сродкам для змяншэння вагі застаюцца фізічныя практыкаванні.

**СМ**

## КАЛЯНДАР

### Люты

**2** — Грамніцы ў каталікоў.
**8** — Сырны тыдзень або Масленіца ў праваслаўных. Апошні тыдзень перад Велікодным постам.
**8** — 200 гадоў з дня нараджэння Івана Хруцкага, класіка беларускага жывапісу.
**12** — 100 гадоў таму адбылося першае вялікае прадстаўленне тэатральнай трупы Ігната Буйніцкага. У зале гуртка чыгуначнікаў у Вільні акторы паказалі камедыю «Па рэвізіі».
**15** — Грамніцы (Стрэчанне) у праваслаўных. Калі на Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы (калі на Грамніцы цёпла, адліга, то вясна будзе ранняя).
**14** — Дзень святога Валянціна (Дзень закаханых).
**17** — Папялец у каталікоў. Першы дзень Вялікага посту.
**19** — 75 гадоў народнаму артысту Беларусі, актору Купалаўскага тэатра Генадзю Аўсяннікаву.
**24** — 75 гадоў народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну.
**28** — Свята-карнавал Пурым у юдэяў.

## Газетка дзеткам



Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Еду, еду, еду,
Ніяк не даеду.
Прыпрагу сароку,
Паеду далёка,
У новай кашулі
Да свайго дзядулі.
Дзед дасць піражочак
І сыру кусочак.

**З народнага; больш вершаў на dzietki.org**

## КЕМІКІ

### Падбяры літары так, каб выйшла новае слова

| | |
|---|---|
| ??дзённік | скула |
| волава | су?бота |
| бусак | |
| гамонка | |
| здоба | |
| жаўнер | |

**Склала Валянціна Карнялюк**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**З праграмы расійскага тэлеканала ОРТ «Вялікая розніца» беларуская цэнзура выразала сатыру на Аляксандра Лукашэнку. Але сайт тэлеканала выставіў відэа і ў інтэрнэт. Старонка 5.**

**Пабачыць ролік можна на сайце «Нашай Нівы» NN.BY.**

PHOTO.BYMEDIA.NET



**У Беларусі пабываў Уэйн Грэцкі — мегазорка сусветнага хакея. Яго продкі выехалі ў ЗША з Гарадзеншчыны ў пачатку стагоддзя.**

PHOTO.BYMEDIA.NET



**І расійская поп-дзіва Ганна Семяновіч — беларуска па бабулі. Таму заявіла, што не супраць выступіць за Беларусь на «Еўрабачанні».**

REUTERS



**Дзяржаўныя дзеячы таксама людзі. Дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан губляе туфлік падчас сустрэчы з французскім прэзідэнтам Нікаля Сарказі на парозе Елісейскага палаца ў Парыжы.**

СЯМЁН ПЕЧАНКО




**Вестэрнізацыя па-нясвіжску. Аздабленне адной з крамаў.**

COMICS BY LIVEJOURNAL.COM




## АНЕКДОТЫ

* * *

Колькі гарылаў трэба, каб закруціць лямпачку?

Гарыла — адна. А вось лямпачак...

* * *

Усе мужыкі розныя, але аднолькава.

* * *

На вуліцы невялікага горадка спаткаліся два бізнэсоўцы.

— Ну, як табе наш новы мэр? Ты ж быў ужо ў яго на прыёме?

— Сапраўдны дэмакрат — адкрыты, просты! Не пагрэбаваў узяць замызганымі і дробнымі купюрамі без усякага канверта. Не тое, што папярэднік — індык надзьмуты.

* * *

Жанчыны часта трапляюць у аварыі, бо своечасова не падаюць сігнал пра тое, што збіраюцца рабіць. Трэба сказаць, што ў аўтамабілі і не прадугледжаны сігнал, які б паказваў, што яны збіраюцца рабіць.

* * *

Цуды грамадзянскай авіяцыі: сняданак — у Варшаве, абед — у Лондоне, вячэра — у Нью-Ёрку, багаж — у Буэнас-Айрэсе.

* * *

— Янка, што ты рабіў сёння вечарам?

— Ну, мам, ізноў ты дэтэктываў наглядзелася.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У беларускіх губернях цэны на зямлю вельмі пайшлі ўгару. У Слуцкім павеце плацяць ад 350 рублёў за дзесяціну. Найбольш купляюць мужыкі, і то не праз банк, а за гатовыя грошы.

**«НН». №5. 1910**

Швейцарская пракуратура выдала міжнародны ордэр на арышт сакратара Саюза Расіі і Беларусі Барадзіна за крутельствы, адмыванне злачынных грошай і карупцыю. І вось Барадзін выступае на НТВ. Журналіст яму трапіўся такі, што проста кішкі выеў. Урэшце журналіст у яго пытаецца: — Дык Вы не баіцеся арышту? — Не я баюся, а мяне бойцеся. — А саюз з Беларуссю будзе? — Не проста будзе, а такі будзе Саюз, што ваша НТВ закрыем.

**«НН». №5. 2000**

**Адказы да старонкі 15**

Гадзіннік, галава, гусак, рамонак, жадоба, каўнер, акула, турбота

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.**
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6305.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 02.02.2010.
Замова № 527.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10005